А может, только делал вид, что смотрит в окно, а сам слушал и замечал все, что происходило здесь, в почтовом доме, чтобы потом, когда-нибудь через годы, написать с такой теплотой и сердечностью о простом смотрителе, которого мог наблюдать и знать на десятках станций Российской империи.

Видно, сказал он устами своего героя и о себе: "...почти все почтовые тракты мне известны; несколько поколений ямщиков мне знакомы; редкого смотрителя не знаю я в лицо, с редким не имел я дела..."

Может, вспомнились ему строки друга Петра Андреевича Вяземского:

Коллежский регистратор,
Почтовой станции диктатор.

Через шесть лет, болдинской осенью, он поставит эти слова эпиграфом к одной из повестей Белкина — к "Станционному смотрителю" и начнет его словами, которые не раз, наверно, приходили на ум в дорожной сутолоке и суете:

"Кто не проклинал станционных смотрителей, кто с ними не бранивался? Кто, в минуту гнева, не требовал от них роковой книги, дабы вписать в оную свою бесполезную жалобу на притеснение, грубость и неисправность? Кто не почитает их извергами человеческого рода, равными покойным подьячим или, по крайней мере, муромским разбойникам? Будем однако справедливы, постараемся войти в их положение и, может быть, станем судить о них гораздо снисходительнее. Что такое станционный смотритель? Сущий мученик четырнадцатого класса, огражденный своим чином токмо от побоев, и то не всегда (ссылаюсь на совесть моих читателей). Какова должность сего диктатора, как называет его шутливо князь Вяземский? Не настоящая ли каторга? Покою ни днем, ни ночью. Всю досаду, накопленную во время скучной езды, путешественник вымещает на смотрителе".

Думал ли Пушкин в тот вечер о тяжкой судьбе российских смотрителей или о чем другом, но нам сегодня трудно представить, что, так никем и не встреченный, он затерялся в толпе проезжих. Нет, не затерялся. Любовью нашей и благодарной памятью он через полтора столетия выхвачен, вынесен из этой толпы, выделен как брат и друг,

словно мы там, рядом с ним. А уж мы-то могли бы встретить великого поэта...

Дорожный день 7 августа был, как и другие, с редкими остановками. Сначала проехали 71 версту от Могилева до Орши, потом еще 37 верст до Бабиновичей и 47 — до Витебска. А всего — 155!

Но если судить по его подорожной, очевидно, Витебск в этот день — 7 августа — был последним пунктом на пути, и ясно — Пушкин задержался здесь, на станции. Ведь на следующий день предстояло (опять если судить по подорожной) проехать самый длинный прогон — отрезок пути в 213 верст да еще успеть в Колпино сделать остановку на несколько часов.

Чем запомнился ему Витебск? О чем думал поэт, проходя (или проезжая) мимо ветхих домиков и сверкающих куполами церквей?

Ровно два месяца назад ему исполнилось двадцать пять лет, а сегодня — день рождения Дельвига. И снова — день, проведенный в разлуке. Трудно сказать, что сулит жизнь, во всяком случае — не только славу.

Пять лет уже тянется ссылка. И еще суждено немало унижений, вплоть до надзора и слежки в родительском доме в Михайловском, сплетен и клеветы в Петербурге и Москве. Но и самое главное тоже впереди — его гениальные творения, его озаренные ярчайшим солнцем дни созидания...

А Витебск был лишь короткой остановкой, хотя потом еще долго по-разному откликался в его жизни. То в плане работы над историей Петра I он записывал Минск, Могилев, Оршу и Витебск. То в одной из рецензий сказал с горечью о сетованиях белорусов, "народа, издревле нам родного, но отчужденного от России жребиями войны". Белорусом оказался управляющий болдинским имением Осип Матвеевич Пеньковский. И прообразом Дубровского — одного из самых любимых пушкинских героев, стал человек, который жил в нашем крае...

Трудно представить, чтобы непоседливый и любознательный поэт просидел весь вечер на скучной станции. И, наверно, всполошился Никита, обнаружив, что нет Александра Сергеевича на почтовом дворе. Наверно, искал его, как приходилось делать не однажды. Нашел ли? Сам ли быстро вернулся в этот короткий тихий вечер?

Может, поэт летящей своей походкой лишь промелькнул по темным улицам? (В Витебске еще не было фонарей. Они зажглись только через три года, в 1827-м.)

А может, неторопливо бродил под высоким небом по набережной Двины и повторял недавно написанные строки, как и многие другие, не попавшие при жизни в печать. Он смотрел на Двину, а думал, конечно, о море, о судьбах друзей и близких, с которыми расстался, и о собственной судьбе.

Над Витебском, как и над всей Российской империей, стояла зловещая тишина. Ничто как будто не предвещало грозы. И все-таки она зрела. Ее готовили друзья поэта, те, кого потом назовут декабристами. И среди их бумаг найдут пушкинские вольнолюбивые строки, которые тоже помогли разгораться пламени будущего восстания.

А пока дремал губернский город. Созревали яблоки в прибрежных садах. И веяло предосенним холодком.

Уже осыпались августовские звезды, падали куда-то в придвинские леса, пересекая тонкими сияющими полосками синеву. Загадывал ли он желание? И если да, то каким оно было? Улыбался ли, грустно ли глядел на незнакомый неприветливый город и одиноких прохожих? Хочется думать, что улыбался, что новые светлые замыслы в этот вечер окружали его, теснились вокруг.

И — пусть будет так! — заснул с улыбкой, словно посылая ее через годы нам в конец двадцатого столетия...

— Не пора ли ехать, Александр Сергеевич? — будил Никита. — Лошади готовы... А то, глядишь, в Колпино и до завтра не доберемся. Далековато еще, кажись...

Мелькнули витебские улицы и исчезли навсегда — больше ни разу в жизни не доводилось Пушкину бывать здесь. А потом дорога в 110 верст вела до Полоцка. И еще 103 версты ехали до Себежа.

Под мерный цокот копыт, должно быть, хорошо думалось. И, возможно, вспоминались стихи. Хорошо сочетались бы с дорожными его размышлениями, мне кажется, строки из “Телеги жизни”, написанной тоже совсем недавно:

Хоть тяжело подчас в ней бремя,
Телега на ходу легка;
Ямщик лихой, седое время,
Везет, не слезет с облучка.

Образ времени часто преследовал его. Может, потому так любимо было и само слово “время”. Я заглянул в “Словарь языка Пушкина”. Против этого слова пометка — 932. Значит, около тысячи раз в его прозе и стихах прозвучало оно, отмеряя свои радостные и грустные, тяжелые и легкие шаги на жизненных дорогах.

Катит по-прежнему телега,
Под вечер мы привыкли к ней
И дремля едем до ночлега,
А время гонит лошадей.

В Колпино, хоть было оно все в той же Витебской губернии Себежского уезда, добирались долго. Пушкин решил, что об этом нарушении предписанного маршрута все равно никто не дознается. А если и до-

знается — что там слова увещеванья в сравнении с мимолетной радостью встречи. Да и дорога подходила уже к концу. Совсем мало оставалось верст до Опочки, а там рукой подать — и Михайловское.

Хозяина имения, к которому так хотел заехать, дома не оказалось. Пришлось оставить записку, краткую и чуть грустноватую.

Спасибо судьбе за то, что так случилось! Ведь записка — единственное, его рукой написанное за эту многодневную дорогу свидетельство и самой дороги, и того, что свернул с нее по желанию сердца в предпоследний день следования по "предназначенному маршруту". А вот и сама эта записка: "Александр Пушкин сердечно благодарит Игнатия Семеновича Зеновича за его заочное гостеприимство. Он оставляет его дом, искренно сожалея, что не имел счастья познакомиться с почтенным хозяином. 8 августа 1824 года".

— Что ж, — сказал он Никите, — отзвонил — и с колокольни долой!.. Поехали!

Коляска затряслась по ухабам. А Белая Русь скрылась вдали. Но она напоминала о себе еще не раз в его короткой и бурной жизни.

Полгода Пушкин жил уже в Михайловском. А где-то в центре озерного края, в Витебске, гостил в эти дни у родных старый лицейский друг Антон Дельвиг.

*1977*

*З. Афанасьева*

## ПА МАРШРУТАХ ПАЭТА

Полацк, Віцебск, Магілёў, Чачэрск... Паштовыя станцыі на старажытным Беларускім тракце. Гэта — незвычайная карта. У яе правым кутку чытаю: "Карта вандраванняў А. С. Пушкіна". Склалі яе навуковыя супрацоўнікі Усесаюзнага музея А. С. Пушкіна. Упрыгожваюць карту мініяцюрныя малюнкі пяром з адлюстраваннем старажытных верставых слупоў, паштовых троек і коннікаў. На вялікім адрэзку шляху самага заходняга пушкінскага маршруту ад Пскова да Кіева паштовыя станцыі ў Полацку і Віцебску — чацвёртая і пятая па ліку з нанесеных на карту.

Пачатак вандраванняў паэта — 1820 год. За вольналюбівыя вершы і эпіграмы Пушкін ледзь пазбег ссылкі ў Сібір, быў па загаду цара высланы з Пецярбурга на поўдзень Расіі. Па Беларускаму паштоваму тракту паэт дабраўся да месца свайго прызначэння — у горад Екацерынаслаў. Карыстацца паслугамі пошты можна было толькі пры наяўнасці падарожнай — дакумента, які засведчваў асобу вандроўніка і мэту паездкі. Атрымаць жа такі "для свабоднага праезду пашпарт" можна было, напрыклад, у губернскім горадзе Віцебску "ад начальніка губерні". А ў павятовым Полацку "оные (подорожные) выдаются от городничих", паведамляецца ў "Правілах для праязджаючых на поштах", якія захаваліся да нашых дзён з пушкінскага часу. Ва Усесаюзным музеі А. С. Пушкіна захоўваецца тая самая падарожная паэта, датаваная 5 мая 1820 г., якую прад'яўляў ён станцыйным наглядчыкам.

— Менавіта з Беларускім паштовым трактам, — расказвае навуковы супрацоўнік музея Н. І. Граноўская, — была звязана задума напісання Пушкіным "Запісак маладога чалавека". Мяркуючы па задуме, герой аповесці, малады прапаршчык, едзе ў маі 1825 г. у Чарнігаўскі полк, дзе адбылося паўстанне. Ва ўрыўку апісана адна са станцый Беларускага паштовага тракту...

"Карта вандраванняў А. С. Пушкіна" нядаўна была рэпрадуктавана ў новым альбоме "Домік станцыйнага наглядчыка. Музей дарожнага быту пачатку XIX стагоддзя", выпушчаным у свет Ленвыдавецтвам (Ленінград, 1985).

*1986*

*Аляксандр Распопаў*

# СУСТРЭЧА А. С. ПУШКІНА Ў МАГІЛЁВЕ 1824 г.

У 1824 годзе ў губернскім горадзе Магілёве знаходзілася галоўная кватэра 1-й арміі. Пры галоўнай кватэры 1-й арміі была вучэбная кавалерыйская каманда для ўдасканалення па службе маладых афіцэраў, у ліку якіх знаходзіўся тады і я на службе ў Лубенскім гусарскім палку.

6 жніўня 1824 года, калі перад манежам палкавая музыка іграла зару, а публіка, карыстаючыся святочным днём і прыемным надвор'ем, гуляла па Шклоўскай вуліцы, праязджала на паштовых, павольна, каляска; перад ёю нехта ішоў у афіцэрскай фуражцы, шынель напашкі, у чырвонай шаўковай, рускага крою кашулі, падперазаны агагінікам. Каляска звярнула па Ветранай вуліцы на пошту; я зараз жа паспяшаўся за ёю, каб дазнацца, хто прыязджае. Наглядчык сказаў мне, што едзе з Адэсы калежскі асэсар Пушкін; я адразу ж кінуўся ў пасажырскі пакой і, узяўшы Пушкіна за руку, спытаў у яго:

— Вы, Аляксандр Сяргеевіч, напэўна, мяне не пазнаяце? Я — пляменнік былога дырэктара ліцэя — Ягора Антонавіча Энгельгарта; у святочныя дні мяне бралі з корпуса ў Царскае Сяло, дзе вы з Дэльвігам прымушалі мяне дэкламаваць вершы.

Пушкін, абдымаючы мяне, сказаў:

— Памятаю, памятаю, Саша, ты жвавы быў кадэт.

Я, ад радасці такой нечаканай сустрэчы, не ведаў, што рабіць; бегма пабег да таварышаў, што гулялі са мною, паведаміць ім, што праязджае наш дарагі паэт А. С. Пушкін (у той час усе зацікаўлены былі "Яўгеніем Анегіным", выйшла VI глава гэтага рамана пра дуэль Яўгенія з Ленскім). Усе паспяшаліся на пошту. Захаплення нельга апісаць. Пушкін загадаў адкаркаваць некалькі пляшак шампанскага. Пілі за ўсё, што прыходзіла ў галаву: за здароўе нянькі, Тані і за супакой душы Ленскага. Але гэтага для нас было мала: у захапленні, што з намі вялікі паэт Пушкін, мы ўзялі яго на рукі і аднеслі непадалёк на маю кватэру (я жыў разам з карнетам Куцынскім). Пушкін быў захоплены нашым энтузіязмам, мы ўзнімалі на руках дарагога госця, пілі за яго здароўе, за гонар і славу ўсяго ім створанага. Пушкін быў у самым вясёлым і прыемным настроі, ён ускочыў на стол і прадэкламаваў:

Я люблю вечерний пир,
Где веселье председатель,
А свобода, мой кумир,
За столом законодатель.
Где до утра слово “пей”
Заглушает крики песен,
Где просторен круг гостей,
А кружок бутылок тесен.

Зняўшы Аляксандра Сяргеевіча са стала, мы пачалі яго падкідаць на руках, а князь Абаленскі закрычаў:

— Панове, гэтая ўрачыстасць выходзіць за межы агульнай радасці, яна павінна быць адзначана чым-небудзь асаблівым. Панове! Зробім нашаму куміру ванну з шампанскага!

Усе згадзіліся, але Пушкін, усміхнуўшыся, сказаў:

— Сябры мае, шчыра ўдзячны, сапраўды было б цудоўна, я не супроць папаласкацца ў шампанскім, але спяшаюся: ехаць трэба.

Гэта было ў 4 гадзіны раніцы. Мы ўсе гурмою праводзілі яго на пошту, дзе зноў з’явілася шампанскае, і, развітаўшыся, пажадалі яму шчаслівай дарогі...

*Пераклад з рускай мовы Сяргея Грахоўскага* *1876*

*Оксана Воротникова*

# ГЕОРГИЙ КОНИССКИЙ. ПРАВОСЛАВНЫЕ РЕМИНИСЦЕНЦИИ В ТВОРЧЕСКОЙ БИОГРАФИИ А. С. ПУШКИНА

*История народа принадлежит поэту.*

А. С. Пушкин, из письма к Н. И. Гнедичу. 1825 г.

Имя белорусского епископа Георгия Конисского (1717–1795) связывается с исторической публицистикой А. С. Пушкина. В 1836 г., будучи уже зрелым поэтом, он обратился к только что изданному протоиереем И. Григоровичем Собранию сочинений Георгия и предпринял попытку оценить его многолетние труды.

Факты таковы, что к 1836 г. А. С. Пушкин был известен еще и как автор исторической прозы и публицистики, представлявшие просвещенному обществу стройное историческое мировоззрение.

В его основе представление о развитии России, ее культуре как общеевропейском процессе с учетом своеобразия русского исторического процесса. “России определено было высокое предназначение, — писал Пушкин, — ее необозримые равнины поглотили силу монголов и остановили их нашествие на самом краю Европы...” Белорусские земли и конфессии в контексте социальных сдвигов во второй половине XVIII в. весьма занимали поэта. Входя в круг образованной свояченицы Н. К. Загряжской, где в беседах он находил “необыкновенную прелесть историческую и поэтическую”, занимательные сюжеты, он черпал полезную историческую информацию. Здесь он встречался со М. М. Сперанским, обсуждая с ним время Александра I, Пугачева, Ермолова, Собрание законов и т. д. Последнее выдавало пристрастие Пушкина-историка, археографа. Сперанский, в частности, советовал писать ему историю своего времени. Может быть, так бы и случилось, а пока поэт проводил “изыскания” в государственном Санкт-Петербургском архиве при подготовке “Истории Пугачева”, в библиотеке Вольтера (купленной Екатериной II и хранившейся в Эрмитаже). Именно как поэт оценивает он “простодушную наготу летописи”, восторженно отзывается о занятиях Августа Людвига Шлецера, который “переписывал летописи слово в слово, буква в букву”. Несомненно то, что Конисский, защищая права православных диссидентов в Варшаве, выписывал из Белоруссии и Киева древние акты на собственность и должности,

а затем устроил при Архиерейской кафедре в Могилеве архив (некоторые акты из которого попали в "Белорусский архив" издания Григоровича 1824 г.), сближало исследователей в отношении исторических источников.

А. С. Пушкин со страстью изучал документы, и, видимо, не случайно оценивал перо Карамзина как гармоническое. Заметки Пушкина по русской истории XVIII в. "обогатили историческую науку емкой характеристикой православия, поставили вопрос о соотношении власти духовной и светской, связи греческого вероисповедания с особенным национальным характером", роли духовенства.

Ключевой фразой к пониманию связи Пушкин — Конисский, по-видимому, можно считать следующую: "Проповеди Георгия просты и даже несколько грубы, как поучения старцев первоначальных, но искренность их увлекательна..." Безусловно, поэтическое видение Поэта, одаренность чувственной природой позволили заметить эту искренность, дать развиться интересу ко всему многообразному материалу из наследия просвещенного епископа. Фактография жизни епископа полноценно отражена в Очерке, предпосланном Собранию сочинений Иоанном Григоровичем. В жизнеописании Конисского подчеркивается: им владела мысль, что просвещение духовенства должно предшествовать просвещению народа. Буквально это перекликается со строкой Пушкина "Мы обязаны монахам нашей историею, следственно, и просвещением" и широко разрабатывалось у Сперанского. Это положение, таким образом, является достоянием общественной мысли того времени. Его преподавательская деятельность в классе поэзии Киево-Могилянской академии, издательская деятельность, которая вызвала напечатание работы Феофана Прокоповича "О поэтическом искусстве", сближали поэта с православным пастырем. Помещая "отдельные мысли" и исторические зарисовки Георгия, Пушкин был субъективен: философские афоризмы перемежаются с авторскими образами, свидетельствуя о встрече с истинным поэтическим талантом. Выспренные немногочисленные силлабические стихи на русском, польском и латыни оценены слабыми в художественных достоинствах. Хотя и виден "дух мыслящий". Элегия Георгия, приводимая поэтом, прямолинейно афористична: "Изнеможешь, пеший, таща грехов ношу!", "Не весь ли век твой есть цепь грехов?", "Без масла дел благих гаснет свеча веры", "Плод добрых дел тебе принесть остается"... Видимо, поэтому Пушкин полностью цитирует "мысли", давая самому читателю проникнуть в талант Георгия:

"Для молитвы пост есть то же, что для птицы крылья..."

"Душа бессмертная, от бренного тела, как птица из растерзанной сети, весело взлетевши, воспаряет в рай богонасажденный, где вечно цветет древо жизни..."

“Радость плотская ограничивается наслаждением... радость духовная есть радость вечная...”

“Мы познаем разумом души; а телесные очи суть как бы очки, чрез кои душевные очи смотрят...” и т. д.

Условно выделяются основные темы, объединяющие творчество Конисского и Пушкина: природа и вера, противоречивость души человека, слово (как поэтические глаголы, как знак, как литургический атрибут). Здесь есть материал для литературной критики, но главное в фигуре Георгия для Пушкина — это достоинство критика истории, столь важного для второй половины XVIII – начала XIX в.:

“Критика состоит в ученом сличении преданий, в остроумном изыскании истины, в ясном и верном изображении событий” (о Карамзине).

“Под словом критики я разумею глубокое изучение достоверных событий и ясное, остроумное изложение их истинных причин” (о Конисском).

*1992*

*Ігар Сцяпунін*

# НЯЎЛОЎНЫ АСТРОЎСКІ

Можа, і не ўсе гісторыкі ведаюць, што першапачатковая назва захапляючага пушкінскага рамана "Дуброўскі" была "Астроўскі". У пісьме ад 2 снежня 1832 г. А. Пушкін паведамляў з Пецярбурга свайму маскоўскаму сябру П. Нашчокіну, што "первый том "Островского" кончен", што напісаны ён "в две недели" (з 21 кастрычніка па 1 лістапада 1832 г.). З пушкінскага плана рамана "Астроўскі", які папярэднічаў плану да рамана "Дуброўскі", відаць, што паэт некалькі па-іншаму, чым у рамане "Дуброўскі", збіраўся раскрыць вобраз галоўнага героя. У адрозненне ад Дуброўскага пушкінскі Астроўскі больш цесна звязаны са сваімі дваровымі людзьмі. Ён уцягваецца ў іх барацьбу з царскімі ўладамі, заступаецца за сваіх людзей, якіх суд абвінавачвае ў забойстве засядацеля, і нават сам распраўляецца з судзейскімі чыноўнікамі ("вяжет суд") [1]. Назва "разбойник" ужываецца Пушкіным не ў прамым, а ў пераносным сэнсе, атаясамліваецца са словам "мятежник" [2]. І пушкінскі Астроўскі — гэта мяцежны дваранін, які не згаджаецца прымірыцца з самавольствам багатага памешчыка, уступае ў барацьбу з тымі, хто мае ўладу. Ён надзелены ярка выяўленымі рысамі бунтарства.

У аснову пушкінскага рамана пакладзены сапраўдныя факты з жыцця беларускага небагатага шляхціца Паўла Астроўскага. Пра іх расказаў Пушкіну ў Маскве ў верасні 1832 г. Павел Воінавіч Нашчокін. Гэта настолькі ўсхвалявала і захапіла паэта, што ў яго ўзнікла задума напісаць раман пра Астроўскага, аб чым Аляксандр Сяргеевіч паведаміў сваёй жонцы Наталлі Мікалаеўне ў лісце ад 30 верасня 1832 г. [3] Аб паведамленні П. Нашчокіна пра гэтага героя вядома нам са слоў літаратуразнаўца П. Барценева і гісторыка М. Пагодзіна. Паводле сведчання Барценева, Астроўскі "имел процесс с соседом за землю, был вытеснен из именья" [4]. Той жа факт, толькі без упамінання прозвішча, паведамляў Пагодзін у пісьме да П. Вяземскага ад 29 сакавіка 1837 г.

---

[1] Пушкин А. С. Полн. собр. соч.: В 10 т. М., 1964. Т. 6. С. 769, 770; 1965. Т. 10. С. 423.

[2] Словарь языка Пушкина. М., 1957. Т. 2. С. 653; 1959. Т. 3. С. 919, 920.

[3] Пушкин А. С. Полн. собр. соч. Т. 10. С. 421.

[4] Пушкин в воспоминаниях современников. М., 1985. Т. 2. С. 224.

Памешчык, якога разарыў сусед, “оттягав его землю”, піша Пагодзін, “взял своих крестьян, оставшихся без земли, и пошел с ними разбойничать” [5]. Паводле Барценева, Астроўскі помсціць у першую чаргу “чортаву насенню” — судзейскім чыноўнікам. Ён, “оставшись с одними крестьянами, стал грабить сначала подьячих, потом и других”, прычым кіраваўся пачуццём асабістай крыўды [6]. Яго выхад “у разбой” быў своеасаблівай формай пратэсту супраць сацыяльнай несправядлівасці.

Барацьба Астроўскага са сваімі крыўдзіцелямі і прыгнятальнікамі скончылася трагічна. Паводле Барценева, Нашчокін бачыў Астроўскага, ужо арыштаванага паліцыяй, у астрозе. Са слоў Пагодзіна, Астроўскі “несколько раз был пойман, переходил через суды разные очень оригинально” [7].

Новыя звесткі пра Астроўскага былі надрукаваны ў 1937 г. [8] Аўтарам гэтых успамінаў, паводле сведчання І. Андронікава, з'яўляецца чыноўнік В. Ігнатовіч-Завялейскі, ураджэнец Магілёва, які пераехаў у Пецярбург, дзе служыў у Міністэрстве фінансаў, у Дэпартаменце замежнага гандлю. З А. Пушкіным ён сустракаўся ў 1830-х гадах [9]. В. Завялейскі ў некаторых дэталях разыходзіцца з Барценевым і Пагодзіным. Ён нічога не гаворыць пра судовую цяжбу, якая вымусіла Астроўскага ўступіць у барацьбу з тымі, хто меў уладу. У Завялейскага Астроўскі — гэта ідэйны змагар, своеасаблівы экспрапрыятар, які “грабил с разбором; у кого лишнее, он отнимал это лишнее; встретясь в лесу или на дороге с нищим, он делился с ним тем, что сам имел”. Самае каштоўнае ў Завялейскага — гэта сведчанне пра месца дзейнасці героя — Віцебшчыну. (Завялейскі некаторы час жыў у Віцебску, дзе ў 1826 г. разглядалася справа “аб дваранскім паходжанні роду Завялейскага”, якая была вырашана на яго карысць [10].) Завялейскі паведамляў, што ў Віцебску ён многа наслухаўся аб Астроўскім. Там, на Афіцэрскай вуліцы, ён бачыў арыштаванага шляхціца “в тяжких цепях на ногах, с железным толстым прутом в руках” [11].

Павел Нашчокін таксама чуў пра Астроўскага і ў Віцебску бачыў яго. З Віцебшчынаю былі цесна звязаны яго бацька — генерал-паручнік Воін (Дарымедонт) Васільевіч Нашчокін і малодшая сястра Ганна Воі-

---

[5] Звенья. М.; Л., 1935. Т. 6. С. 152.

[6] Пушкин в воспоминаниях современников. С. 223–224.

[7] Звенья. С. 152.

[8] Прототип Дубровского: Из неопубликованных воспоминаний современника Пушкина // За индустриализацию. 1937. 10 февр.

[9] Андроников И. Тетрадь Василия Завелейского // Прометей. М., 1968. Т. 5. С. 209, 210; Черейский Л. А. Пушкин и его окружение. Л., 1989. С. 160.

[10] НА РБ. Ф. 1430, воп. 1, спр. 564, арк. 1–16.

[11] Прототип Дубровского // За индустриализацию. 1937. 10 февр.

наўна. 31 кастрычніка 1789 г. імператрыца Кацярына II падаравала Воіну Нашчокіну "ў вечнае родавае карыстанне" за "старанную службу" 27 беларускіх вёсак з 700 душамі мужчынскага полу ў Себежскім павеце Віцебскай губерні. Гэтымі вёскамі раней пажыццёва валодалі ваеннаслужылыя людзі, так званыя панцырныя баяры. Па ўказу Кацярыны II яны былі бесцырымонна выцеснены, а В. Нашчокін зрабіўся ўладальнікам іх зямель [12]. Пасля яго смерці ў 1860 г. гэтыя землі перайшлі ў спадчыну да дачкі — Ганны Воінаўны, якая падтрымлівала сваяцкія адносіны са сваім братам Паўлам і яго сынамі — Аляксандрам і Андрэем [13]. І, магчыма, ад яе П. Нашчокін чуў пра беларускага шляхціца Астроўскага, лёс якога вельмі нагадвае трагічны лёс многіх панцырных баяр. Астроўскі ў выніку судовага працэсу застаўся без сродкаў існавання і прытулку, што падштурхнула яго стаць "чалавекам па-за законам".

Усе падзеі, якія звязаны з Астроўскім як літаратурным героем, маглі адбывацца не пазней верасня 1832 г., калі А. Пушкін сустракаўся ў Маскве з П. Нашчокіным і ад яго пачуў аповяд пра беднага шляхціца з Беларусі. У той час шмат хто ведаў пра сумныя прыгоды маладога шляхціца Паўла Астроўскага — ураджэнца мястэчка Раванічы Ігуменскага павета (цяпер Чэрвеньскі раён).

Першыя звесткі пра Паўла Астроўскага ў наш час былі апублікаваны ў часопісе "Неман" у 1968 г. [14] Цяпер знойдзены новыя архіўныя матэрыялы, якія дапамагаюць раскрыць аблічча гэтага чалавека. Павел Астроўскі нарадзіўся ў 1810 г., ён з'яўляецца прадстаўніком старажытнага збяднелага шляхецкага роду. Яго продкі з 20 сакавіка 1672 г. былі ўладальнікамі вотчыннага маёнтка Аржахневічы, або Астраўшчызна, які знаходзіўся ў Дзісенскім павеце Мінскай губерні (цяпер Міёрскі раён Віцебскай вобласці), "в 9-ти верстах от города Дисны". Астроўскія былі ўладальнікамі маёнтка да 1781 г., а 18 сакавіка таго ж года Юрый Міхайлавіч Астроўскі, яго сыны і пляменнікі чамусьці "продали Ласкому часть имения Оржехневичи или Островщизна с 5 дворами крестьян". Але дваранін Лаской потым завалодаў усім маёнткам. З архіўных крыніц таксама вядома, што "во время нашествия французских войск в 1812 году имение осталось совершенно разграблено и разорено, крестьяне частию разбеглись по неизвестным местам, частию из болезни умерли..." Пазней маёнтак Аржахневічы, ужо не заселены сялянамі, называецца ў навакольных вёсках толькі Астраўшчызнаю. У тым жа 1812 г. у Астроўскіх "все документы истреблены вместе с

---

[12] НА РБ. Ф. 3310, воп. 2, спр. 36, арк. 1–42.

[13] Раевский Н. А. Друг Пушкина Павел Воинович Нащокин. Л., 1977. С. 121, 122.

[14] Степунин И. Прототип пушкинского Дубровского // Неман. 1968. № 8. С. 180–184.

некоторыми жилыми строениями огнем и другими случаями". Гэта адыграла сваю сумную ролю ў далейшым. Родзічы Астроўскага былі вымушаны рассяліцца па розных паветах Мінскай губерні і весці барацьбу за аднаўленне сваіх дваранскіх правоў. Астроўскія падалі прашэнне ў Мінскі дваранскі дэпутацкі сход. Ён прыняў рашэнне на іх карысць, што "род Островских признан в дворянском происхождении". Аднак калі 28 студзеня 1828 г. іх справа пайшла "на рассмотрение Правительствующего Сената в герольдию", дык "разрешения по этому делу не получено". Сенат не зацвердзіў рашэнне Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу і адхіліў прашэнне Астроўскіх [15]. Некалькі іншая сітуацыя апісваецца ў пушкінскім рамане "Дуброўскі". У старога Дуброўскага ў час пажару згарэлі ўсе дакументы на права ўладання маёнткам Кісцянёўка, і гэты факт умела выкарыстаў засядацель Шабашкін, які "по законам" павярнуў справу на карысць усемагутнага Траякурава.

Родзічы Паўла Астроўскага канчаткова страцілі свае правы на дваранскія прывілеі, сталі беззямельнымі шляхціцамі. І Паўлу Астроўскаму — прадстаўніку калісьці славутага, а потым заняпалага роду — давялося самому здабываць сабе хлеб. У рапарце мінскага часовага ваеннага губернатара графа Строганава мінскаму віцэ-губернатару П. Скопіну ад 18 сакавіка 1832 г. адзначалася, што Павел Астроўскі "до взятия в плен был учителем у помещика Помарнацкого" [16]. Наняцца на работу да памешчыка Памарнацкага, напэўна, прымусіла Паўла Астроўскага крайняя неабходнасць, бо лёс настаўнікаў у памешчыцкіх маёнтках быў незайздросны. Зазначым, што многія з роду Памарнацкіх сваім характарам вельмі нагадвалі пушкінскага Траякурава, фанабэрыстага прыгонніка, грубага самадура і невука. Дакументы сведчаць, што 17 верасня 1819 г. віцебскі мешчанін Лужынскі падаваў скаргу ў Віцебскі ніжні земскі суд на памешчыка Віцебскага павета Карла Памарнацкага, які "присвоил его две лошади, стоящие 65 рублей, и прочие вещи, стоящие 60 рублей, да к тому же бил его немилосердно" [17]. Аднак суд не пакараў гвалтаўніка. У 1825 г. рыжскі мешчанін Трыфан Іваноў падаў прашэнне вялікаму князю Міхаілу Паўлавічу (брату імператара Мікалая I) на памешчыка Яраша Памарнацкага, які быў уладальнікам маёнткаў у Віленскай і Віцебскай губернях. Іваноў скардзіўся, што Памарнацкі "причинял обиды и побои ему, его жене и детям" і нават захапіў усю яго маёмасць. Справа разбіралася ў судах доўга: спачатку ў 1825 г. — у Віленскай губерні, а у 1827 г. — у Віцебскай. Скарга

[15] НА РБ. Ф. 319, воп. 2, спр. 2396, арк. 14, 22, 46, 63, 63 адв., 67, 67 адв., 71 адв., 74–78, 81, 84, 84 адв., 90 адв., 93, 94 адв., 98, 99, 142, 145, 146 адв.

[16] Тамсама. Ф. 295, воп. 1, спр. 329, арк. 1.

[17] НА РБ. Ф. 1430, воп. 1, спр. 344, арк. 1–3.

Іванова не была пакінуга без увагі. Не Я. Памарнацкаму, а Т. Іванову была зроблена строгая вымова, "чтобы он впредь не входил с подобными неосновательными прошениями" [18]. Характэрна, што гэтага ж Памарнацкага не пакаралі нават за ўдзел у паўстанні 1830–1831 гг. У 1831 г. ён пры паражэнні паўстання ўцёк у Прусію, але ў кастрычніку 1832 г. захацеў вярнуцца на радзіму. Земскія чыноўнікі Віленскай губерні добра ведалі яго ўчынкі, аднак сцвярджалі, што "оный Помарнацкий до мятежа был поведения хорошего". Хоць многія ўдзельнікі паўстання страцілі свае маёнткі, Памарнацкі поўнасцю захаваў іх[19].

Можна прывесці і іншыя факты, калі царскія ўлады яўна патуралі траякуравым, калі яны рабілі нават цяжкія злачынствы. Так, у 1818 г. царскі суд апраўдаў памешчыка Себежскага павета Антона Есьмана, які завалодаў дакументамі аб дваранскім паходжанні суседа Раманоўскага. Яго сыноў зрабіў ён сваімі прыгоннымі сялянамі, а аднаго з іх здаў у салдаты [20]. У тым жа 1828 г. былі апраўданы памешчыкі Віцебскага павета — адстаўны ротмістр Фелікс Цеханавецкі і яго жонка Элеанора, якія катавалі сваіх прыгонных сялян і вольнанаёмных людзей і нават даводзілі іх да самагубства. У гэтых вылюдкаў былі высокія заступнікі, у прыватнасці магілёўскі губернатар граф М. Мураўёў, пазней празваны "вешальнікам" [21].

"Панства дзікае" царскімі ўладамі яўна апекавалася. Зусім іншыя адносіны былі да дробных беззямельных шляхціцаў, подобных Паўлу Астроўскаму. У сваіх рапартах і данясеннях царскія жандары называлі іх "народом дерзким, буйным и развратным", "безумцами", "бродягами", "смутьянами", з якімі трэба весці самую бязлітасную барацьбу [22]. Паводле сцверджання М. Мураўёва, беззямельныя шляхціцы як "класс людей необузданных и неоседлых" уяўляюць вялікую небяспеку для царскіх улад, таму што яны "стараются в корчмах и народных скопищах возбуждать крестьян к неповиновению" [23].

Да гэтай катэгорыі сацыяльна незабяспечаных шляхціцаў належыць і Павел Астроўскі. У сакрэтных жандарскіх рапартах ён называецца "мяцежнікам", што для царскіх улад было раўназначна тэрміну "разбойнік" [24]. У рапарце шэфу жандараў А. Бенкендорфу 14 красавіка 1831 г. і начальніку штаба ваенных пасяленняў П. Клейнміхелю 29 кра-

---

[18] НА РБ. Ф. 1297, воп. 1, спр. 2242, арк. 1–3.

[19] ЦДГА Літвы. Ф. 137, воп. 4, спр. 251, арк. 4, 4 адв.

[20] НА РБ. Ф. 1416, воп. 1, спр. 4775, арк. 1–46.

[21] Тамсама. Ф. 1297, воп. 1, спр. 2889, арк. 1–59; спр. 4718, арк. 1–33.

[22] Тамсама. Ф. 1430, воп. 1, спр. 3062, арк. 40–44 адв.

[23] Тамсама. Ф. 1297, воп. 1, спр. 5240, арк. 49.

[24] Тамсама. Спр. 6186, арк. 6; ф. 1430, воп. 1, спр. 3548, арк. 3–4.

савіка 1831 г. М. Мураўёў паведамляў пра "разбойніцкія дзеянні" маладых беззямельных шляхціцаў Ігуменскага і Барысаўскага паветаў Мінскай губерні, якія яшчэ не арыштаваны, застаюцца на свабодзе і актыўна дапамагаюць польскім паўстанцам, здзяйсняюць свае варожыя, мяцежныя намеры супраць царскага ўрада, садзейнічаюць беспарадкам у губерні [25]. Паводле сцверджання Мураўёва, таксама вельмі небяспечныя для ўрада і беззямельныя шляхціцы Віцебскай губерні, якія "скитаются в малом числе в виде нищих и разбойников по болотам и лесам, причиняя беспорядки на дорогах и устрашая мирных жителей своим внезапным появлением" [26]. Шляхціцаў-"разбойнікаў" вельмі баяліся буйныя землеўладальнікі, а чуткі аб іх нечаканым з'яўленні "наводят такой страх на помещиков, что некоторые, более робкие, начинают скрывать свое имущество в лесах и зарывать в землю" [27]. Як гаворыць Завялейскі, Астроўскі наводзіў жах на царскіх чыноўнікаў і памешчыкаў нават тады, калі ён быў арыштаваны і сядзеў у астрозе.

Паведамленні сучаснікаў Пушкіна пра актыўную антыўрадавую дзейнасць Астроўскага вельмі верагодныя, бо Павел Астроўскі, які ўжо з юнацкіх гадоў сутыкнуўся з судзейскаю несправядлівасцю, не мог не ведаць пра іншыя факты сацыяльнай несправядлівасці. Супраць царскіх улад Павел Астроўскі выступаў яшчэ да падзей 1830–1831 гг. Паводле звестак Завялейскага, ён "проказничал долго, лет пять-шесть" [28]. З архіўных матэрыялаў вядома, што царскія чыноўнікі, якія ездзілі па Беларускім тракце ў 1827–1828 гг., скардзіліся, што на іх нападалі "шайки разбойников". Усе спробы царскіх улад злавіць іх у 1828 г. на Віцебшчыне былі беспасяховыя [29]. Магчыма, што ў гэтых мясцінах тады дзейнічаў і Павел Астроўскі.

У час паўстання 1830–1831 гг. у яго завязаліся сяброўскія адносіны з шляхціцам Віленскай губерні Лабаноўскім і яго аднадумцамі, якія змагаліся з царскімі ўладамі на тэрыторыі Мінскай і Віцебскай губерняў. Пранікнуты бунтарскім духам, Павел Астроўскі, як сведчаць архіўныя матэрыялы, "вступил в мятежническое ополчение, действовал вооруженною рукою" [30]. Яго антыўрадавая дзейнасць як паўстанца пачалася на радзіме — у Ігуменскім павеце, дзе царскія жандары наладзілі за ім пільны нагляд" [31]. Пазней яго атрад дзейнічаў у Мінскай, затым і ў

[25] НА РБ. Ф. 1297, воп. 1, спр. 5240, арк. 105–108, 265.

[26] Тамсама. Ф. 1430, воп. 1, спр. 3062, арк. 40, 40 адв.

[27] Тамсама. Ф. 1297, воп. 1, спр. 5240, арк. 110, 118.

[28] Прототип Дубровского // За индустриализацию. 1937. 10 февр.

[29] НА РБ. Ф. 1430, воп. 1, спр. 979, арк. 1–29.

[30] Тамсама. Ф. 561, воп. 1, спр. 3, арк. 138 адв.; спр. 4, арк. 130 адв.

[31] Тамсама. Ф. 295, воп. 1, спр. 329, арк. 7.

Віцебскай губернях. На Віцебшчыне Астроўскі карыстаўся славай "няўлоўнага чалавека па-за законам", які "умел вести свои дела так, что его трудно было поймать". Як сведчыць Завялейскі, "у него было много покровителей, даже между дворянами; ему сочувствовали даже некоторые дамы из помещиц средней руки, начитанные романами" [32].

Пакуль што невядома, пры якіх абставінах і дзе канкрэтна яго арыштавалі. Архіўныя матэрыялы толькі павед!амляюць, што Павел Астроўскі ў 1831 г. "взят в плен" [33] і пасаджаны ў Віцебскі астрог, дзе яго бачылі Нашчокін і Завялейскі. Там жа бачыў яго і ад'ютант віцебскага генерал-губернатара князя М. Хаванскага паручнік В. Мызнікаў. У 1831 г. ён па загаду губернатара выконваў абавязкі віцебскага паліцмайстра і актыўна змагаўся за ліквідацыю антысанітарных умоў у віцебскім астрозе, дзе знаходзіліся беларускія шляхціцы-паўстанцы, у тым ліку і Павел Астроўскі [34]. Як чыноўнік па асобых даручэннях пры губернатары Мызнікаў, відаць, добра ведаў судовую справу Астроўскага. З Пушкіным Мызнікаў сустракаўся ў Пецярбургу ў 1831 г., аб чым гаворыцца ў яго пісьме паэту ад 9 верасня 1833 г. [35]

Архіўныя матэрыялы сведчаць, што Паўла Астроўскага разам з групай палонных паўстанцаў збіраліся выслаць у Архангельск, але спачатку адправіць пешшу пад канвоем у горад Пскоў. Гэта была цяжкая дарога. Камандзір батальёна плац-маёр Крываблоцкі і камандзір брыгады палкоўнік Трыпольскі, якія павінны былі ў кастрычніку 1831 г. адправіць Астроўскага і іншых паўстанцаў у Пскоў, адзначалі ў сваіх рапартах, што паколькі адлегласць ад Віцебска да Пскова 370 вёрст, то канвою трэба ісці болей чым два месяцы [36]. Пасля доўгай дарогі Павел Астроўскі трапіў у пскоўскую крэпасць. Пакуль Астроўскі знаходзіўся ў Пскове, следчая камісія па справе ўдзельнікаў паўстання 1830–1831 гг. зноў перагледзела яго асабістую справу. Невядома чаму, але яна зусім не закранала яго антыўрадавую дзейнасць да пачатку паўстання. Магчыма, такіх звестак камісія проста не мела. Адносна ўдзелу ў паўстанні было адзначана, што Астроўскі прымаў удзел у паўстанні не па сваёй волі, а "по наговору мятежника Лобановского" [37]. Асабліва небяспечнымі злачынцамі следчыя лічылі шляхціцаў Лабаноўскіх — Платона, Антонія і Іпаліта, адзін з якіх як быццам і ўцягнуў Астроўскага ў мяцеж [38]. Апрача таго, камісія дакладна не ведала, пры якіх абставінах

---

[32] Прототип Дубровского // За индустриализацию. 1937. 10 февр.

[33] НА РБ. Ф. 561, воп. 1, спр. 3, арк. 138 адв.; спр. 4, арк. 130 адв.

[34] Тамсама. Ф. 1297. воп. 1, спр. 2889, арк. 51; воп. 75, спр. 4840, арк. 4–6.

[35] Пушкин А. С. Полн. собр. соч.: В 16 т. М., 1948. Т. 15. С. 82.

[36] НА РБ. Ф. 1297, воп. 1, спр. 5858, арк. 23, 29.

[37] Тамсама. Ф. 561, воп. 1, спр. 3, арк. 138 адв.; спр. 4, арк. 130 адв.

[38] Тамсама. Арк. 67, 71, 138 адв.; спр. 4, арк. 68, 72 адв.

быў узяты ў палон Астроўскі: са зброяй у руках або без яе. Ад гэтага залежала, ці падлягае ён суроваму пакаранню, ці можа быць дараваны [39]. Лёсам Паўла Астроўскага зацікавіўся генерал-маёр граф Строганаў, які быў прызначаны на пасаду мінскага часовага ваеннага губернатара па загаду імператара Мікалая I “высочайшим указом, данным Правительствующему Сенату в 23 день августа 1831 г.” [40] Паколькі следчая камісія не мела дакладных звестак аб дзейнасці Астроўскага, граф Строганаў выказаў думку, што “Павел Островский, не оказавшийся, по-видимому, виновным в таком преступлении, за которое подлежал бы включению в первые два разряда государственных преступников и как потерпевший за временное заблуждение заключению под стражу, должен быть возвращен на место его родины под надзором губернского начальства” [41]. Гэта прапанова была накіравана на канфірмацыю (зацвярджэнне) галоўнакамандуючаму Першай арміяй барону Ф. фон Остэн-Сакену. Але Павел Астроўскі не стаў чакаць, а сам вырашыў свой лёс.

У рапарце камандзіра пскоўскага пяхотнага зводнага батальёна палкоўніка Жукоўскага віцебскаму генерал-губернатару князю М. Хаванскаму ад 17 сакавіка 1832 г. паведамляецца, што “содержавшийся в г. Пскове в числе военнопленных польских и литовских мятежников уроженец Минской губернии Игуменского повета шляхтич Павел Островский, коему от роду 22 года, неизвестно куда отлучился” [42]. Пра ўцёкі Астроўскага паведамляе і Завялейскі: “Долго спустя говорили, что он ушёл, перекрутив при конвойных свои цепи” [43]. Магчыма, што ўцячы з пскоўскай крэпасці Паўлу Астроўскаму дапамаглі салдаты аховы, з якімі, паводле сведчання Завялейскага, у яго яшчэ ў Віцебску былі сяброўскія адносіны.

У 1832 г. Паўла Астроўскага беспаспяхова шукалі па ўсіх паветах Мінскай губерні, аб чым сведчаць рапарты і данясенні з паліцыі і земскіх судоў Мінска, Бабруйска, Мазыра, Слуцка, Пінска, Ігумена, Рэчыцы, Дзісны, Вілейкі і Радашковіч, якія былі адрасаваны мінскаму грамадзянскаму губернатару А. фон Дрэбушу і мінскаму віцэ-губернатару П. Скопіну [44]. Пошукі Астроўскага з 1832 па 1837 г. ва ўсіх паветах Віцебскай губерні таксама не далі ніякіх вынікаў. Аб гэтым гавораць адрасаваныя віцебскаму грамадзянскаму губернатару М. Шрэдэру і віцеб-

[39] НА РБ. Ф. 561, воп. 1, спр. 3, арк. 138 адв.; спр. 4, арк. 130 адв.

[40] Тамсама. Ф. 1297, воп. 1, спр. 5996, арк. 148.

[41] Тамсама. Ф. 561, воп. 1, спр. 3, арк. 138 адв.; спр. 4, арк. 130 адв.

[42] Тамсама. Ф. 1297, воп. I, спр. 6186, арк. 1.

[43] Прототип Дубровского // За индустриализацию. 1937. 10 февр.

[44] НА РБ. Ф. 295, воп. 1, спр. 329, арк. 1–22.

скаму віцэ-губернатару С. Давыдаву рапарты і данясенні гараднічых і чыноўнікаў земскіх судоў Віцебска, Гарадка, Полацка, Лепеля, Дрысы (Верхнядзвінска), Веліжа, Невеля, Себежа, Суража, Люцына (Лудзы), Дзінабурга (Даўгаўпілса), Рэжыцы (Рэзекне). У Віцебскай губерні на Астроўскага былі заведзены нават тры справы [45], але ніхто не ведаў, дзе ён знаходзіцца. Калі супаставіць пералічаныя гарады з сучасным адміністрацыйным дзяленнем, дык выходзіць, што Астроўскага шукалі на тэрыторыі Мінскай, Гомельскай, Віцебскай, Магілёўскай абласцей Рэспублікі Беларусь, Пскоўскай і Смаленскай абласцей Расійскай Федэрацыі, а таксама на тэрыторыі Латвійскай рэспублікі — фактычна там, дзе жылі беларусы.

Варта падкрэсліць, што паліцыя шукала ўцёкшага "разбойніка" Паўла Астроўскага ў 1832 г. у пушкінскіх мясцінах на Пскоўшчыне якраз тады, калі А. Пушкін працаваў над першым томам "Астроўскага". Магчыма, таму, што Пушкін не ведаў, як складзецца далейшы лёс Астроўскага, ён быў вымушаны замяніць назву рамана на больш нейтральную.

Мяркуем, што важнай падставай для замены назвы рамана было і тое, што пісьменнік пісаў не хроніку жыцця Паўла Астроўскага, а літаратурны твор. А таму ў рамане знайшло адлюстраванне і вядомае тады паданне аб бунце сялян пскоўскага памешчыка Дуброўскага, якое адбылося ў 1737 г. У ім удзельнічаў і сам памешчык, які займаў антыўрадавую пазіцыю.

6 лютага 1833 г. Пушкін завяршыў працу над раманам, але здаваць у друк не спяшаўся.

У кастрычніку 1837 г., калі ўжо Пушкіна не было ў жывых, улады Віцебскай губерні зноў наводзяць даведкі аб Астроўскім. Аднак пошукі так і не далі ніякіх вынікаў. Магчыма, ён уцёк за мяжу імперыі, як іншыя "мяцежнікі", ці схаваўся пад іншым прозвішчам. З 1838 г. пошукі Паўла Астроўскага былі спынены. Далейшы лёс яго так і застаецца для нас загадкавым.

Упершыню раман быў надрукаваны ў 1841 г. Канчатковы загаловак раману "Дуброўскі" далі выдаўцы В. Жукоўскі, П. Вяземскі і П. Плятнёў [46].

Падабенства героя рамана Пушкіна "Дуброўскі" і Паўла Астроўскага заўважаецца не толькі ў біяграфіі, але і ў знешніх прыкметах двух герояў. Паводле архіўных матэрыялаў, Павел Астроўскі "был вы-

---

[45] НА РБ. Ф. 1297, воп. 1, спр. 6186, арк. 1–6; ф. 1430, воп. 1, спр. 3124, арк. 19–63; спр. 3548, арк. 1–4 адв.

[46] Пушкин А. С. Избр. соч.: В 2 т. М., 1978. Т. 2. С. 673; Соболева Т. П. Повесть А. С. Пушкина "Дубровский". М., 1963. С. 3, 8, 9; Маранцман В. Г. Роман А. С. Пушкина "Дубровский" в школьном изучении. Л., 1974. С. 3–4.

сокого роста, бел лицом, волосы светлорусые, с небольшими усами". Да ўцёкаў з пскоўскай крэпасці "одет он был в сюртуке синего сукна с белыми форменными, металлическими пуговицами, в синих брюках и фуражной шапке" [47]. Паводле сведчання Завялейскага, арыштаваны Астроўскі "шел в сером сюртуке, фуражке набекрень... Он был роста выше обыкновенного человека: его голова была выше всякого забора, мимо которого его вели. Лицом он был очень красив, с черными тонкими усиками, но взгляд его больших серых глаз был ужасный... не то чтобы свиреп, а поразителен" [48]. З гэтых матэрыялаў відаць, што прыкметы, якія прыводзяцца рознымі крыніцамі, у асноўным супадаюць, толькі ў Завялейскага ўсё гэта падаецца ў больш выразнай форме.

Гістарычныя сведчанні пра небагатага беларускага шляхціца Паўла Астроўскага — прататыпа пушкінскага Дуброўскага — у свой час адыгралі станоўчую ролю ў савецкім пушкіназнаўстве. Да публікацыі гэтых матэрыялаў лічылася, што вобраз пушкінскага Дуброўскага надуманы, створаны пад уплывам класічных літаратурных вобразаў заходнееўрапейскай рамантычнай літаратуры. Архіўныя матэрыялы пра беларускага мяцежнага шляхціца Паўла Астроўскага яшчэ раз сведчаць аб тым, што ў канву сюжэта пушкінскага рамана, а таксама пры стварэнні мастацкага вобраза галоўнага героя пакладзены матэрыялы, якія ўзяты з самога жыцця, з гераічнай гісторыі Беларусі.

*1995*

---

[47] НА РБ. Ф. 295, воп. 1, спр. 329, арк. 1; ф. 1297, воп. 1, спр. 6186, арк. 10 адв.; ф. 1430, воп. 1, спр. 3542, арк. 1–2.

[48] Прототип Дубровского // За индустриализацию. 1937. 10 февр.

KAMUNIKAT.org

*Людмила Селицкая*

# ДУБРОВСКИЙ — ШЛЯХТИЧ ИЗ–ПОД МИНСКА?

Если верить афористичному пророку Пушкину, чей двухсотлетний юбилей со дня рождения будем отмечать 26 мая будущего года, мы ленивы и нелюбопытны. Плохо знаем свою историю, не любим оглядываться назад и загадывать наперед. Кудрявый гений был прав: прошлое для нас действительно не менее туманно, чем будущее. Два минувших с тех пор века мало что изменили в нашем сознании. Разве что прибавили постреволюционного беспамятства... Впрочем, вместо грустного объяснения причин “нелюбознательного” национального феномена лучше выберем романтическое: может быть, каждой исторической тайне — как и зарытому в землю кладу — должно прийти свое время. Время быть обнаруженными.

## Сказ про белорусского Робин Гуда

Рождение всякого литературного произведения, коему уготована бессмертная судьба, — одновременно и великое таинство, и цепь обычных земных случайностей. Как-то: треп о наследно-поместных делах во время дружеской пирушки, письмецо из отдаленной губернии с кумушкиными сплетнями, гусарские бравады о военных доблестях и подавленных бунтах-мятежах в обширных окрестностях матушки-России.

Гэтыя мясціны Пётр I у свой час прэзентаваў свайму паплечніку Пятру Мацвеевічу Апраксіну. У 1757 г. уладанні Апраксіна набыў арап Пятра Вялікага — Абрам Пятровіч Ганібал, прадзед Пушкіна па маці. Потым яно было падзелена паміж яго сынамі. Частка маёнтка Восіпа Абрамавіча  Ганібала пры разводзе з жонкай Марыяй Аляксееўнай Ганібал (гэта дзед і бабка паэта па маці) па суду адышла ў яе валоданне. Пасля некаторага драблення ўладанні бабулі Пушкіна былі прададзены зусім. За выручаныя грошы адразу ж быў куплены падмаскоўны маёнтак Захарава, дзе ў акружэнні бабулі і нянькі правёў сваё шчаслівае дзяцінства будучы паэт.

Дык вось, паводле сведчанняў сястры Пушкіна Вольгі, Арына Радзівонаўна была родам з сяла Кобрына, якое знаходзілася вярстах у шасцідзесяці ад Пецярбурга. Некаторыя сведкі сцвярджаюць, што нянька Пушкіна нарадзілася ў Суйдзе (Васкрасенскім), а ў Кобрын была аддадзена замуж. Прыгонны “стаж” Арыны Радзівонаўны выглядае так: 1 год —прыгонная Апраксіных, 22 гады — самога Ганібала, потым — у яго сына, потым — у бабулі паэта. Заўважым, што пры продажы Кобрына Арыну Радзівонаўну з яе дачкой Надзеяй гаспадыня пакінула сабе. Надзея і яе муж — Мікіта Казлоў па волі гаспадароў жылі разлучана: яна ў Захараве, ён у Пецярбургу, пры Пушкіне. Не бачыліся гадамі. У 1799 г., як сцвярджаюць многія літаратурныя крыніцы, Арына Радзівонаўна атрымала вольную, але палічыла за лепшае застацца ў Пушкіных.

Хто ж былі бацькі Арыны Радзівонаўны? Яны — Радзівон Якаўлеў (1728–1767) і Лукер’я Кірылава (1730–1796/97) былі прыгоннымі графа Фёдара Апраксіна. Радзівон Якаўлеў (Якаўлеў — гэта не прозвішча: прыгонныя ў Расіі прозвішчы мелі вельмі рэдка; відаць, Якавам звалі яго бацьку) па дакументах вядомы як сірата, якога ўсынавілі Пётр Палуэктаў (1692–1773) і Васа Емяльянава (1698–1754), прыгонныя таго ж Апраксіна. Пётр прозвішча меў, бо заслужыў яго сваім даглядам за прыгоннымі. Бацькі асірацелых нідзе не ўпамінаюцца. Паўстае законнае пытанне, ці не з’явіліся гэтыя сіроты-падлеткі тут разам з іншымі, дарослымі кобрынцамі-беларусамі? І ці не чужына, да ўсяго, і зблізіла іх, і паслужыла перадумовай стварэння сям’і, у якой потым нарадзілася сямёра дзяцей? Сям’я гэта рана страціла бацьку. Сярод усіх з сям’і асабліва цяжка даводзілася Арыне як старэйшай з дзяцей. А было ёй тады толькі 10 гадоў. І жыццё яе, як пачалося бязрадасна, так без радасці і прайшло.

Звернемся цяпер да іншых фактаў, якія маглі б дадаткова сведчыць аб адносінах Арыны Радзівонаўны да такой жа шматпакутнай, як яна сама, Беларусі. Цікавым бачыцца факт, што паўстанне прыгонных Ганібала (1766) вылілася ва ўцёкі ў Польшчу. Ці не дадому?! А як растлумачыць той факт, што адзін з сыноў Арыны Радзівонаўны меў зусім не характэрнае для Расіі мужчынскае імя — Стэфан? (Імя гэта было распаўсюджана ў Рэчы Паспалітай, відаць, у гонар славутага караля і змагара супраць маскоўскай навалы — Стэфана Баторыя.) Прыгадаем, што само імя Арына, як і імя Радзівон, адносіцца да старажытных беларускіх імёнаў. Даследчыкі жыцця і творчасці Пушкіна часта ўказваюць на мілагучнасць і напеўнасць мовы Арыны Радзівонаўны. Гэтыя якасці чалавечай мовы жывуць і сёння на Беларусі, асабліва на Палессі. Пра беларускія элементы ў мове нянькі Пушкіна гаворыць фанетычнае афармленне, што дайшло да нас у двух невялікіх лістах, якія былі адрасаваны ёю да паэта 30 студзеня і 6 сакавіка 1827 г. Адказу на іх, праўда, не маем. Як першы ліст, напісаны пад дыктоўку кімсьці з малапісьменных дваровых, так і другі, запісаны таксама пад дыктоўку, але ўжо Ганнай Міхайлаўнай Вульф, сведчаць аб наяўнасці сінхроннага гучання некаторых слоў і выразаў Арыны Радзівонаўны, з аднаго боку, і сучаснай гутарковай мовы (заходнепаляшуцкі дыялект), з другога. Напрыклад, “дружочик”, “мачиха”, “Арина Родивоновна”, “цалую ваши ручки”. Чытаючы гэтыя лісты, адчуваеш, як у стыхіі рускай мовы бруіцца беларуская гаворка.

Заключаючы гэтыя разважанні пра лёс Арыны Радзівонаўны, хочацца выказаць шкадаванні ў наш агульны адрас, што мы, якія праяўляем вялікую цікаўнасць і да донжуанскага спісу Пушкіна, праходзім міма трагічнага лёсу чалавека, які так па-анёльску паўплываў на паэта.

Так, лёс Арыны Радзівонаўны трагічны, як трагічны лёс Беларусі. І ці не адсюль мой боль, несціхаючы, патаемны боль? Толькі падумаць, што пры шчаслівым збегу акалічнасцей зямля Беларусі магла б мець сваю Сафо, сваю чарадзейку слова...

Вось, бадай, і ўсё.

Што да скарыстанай літаратуры, то аўтар не падае яе спісу таму, што пералік складзе некалькі аб’ёмаў гэтага матэрыялу, таму што Пушкініяна— бязмежная.

*1991*

*Міхаіл Мельнікаў*

# ПУШКІН ПРА НАШ КРАЙ

У сваёй вядомай працы "Гісторыя Пятра" вялікі паэт неаднойчы ўпамінаў пра Магілёў і Крычаў, Мсціслаў і Чэрыкаў, Быхаў і Прапойск, іншыя гарады і населеныя пункты Беларусі. Вялікую цікавасць выклікаюць гэтыя старонкі, важнае значэнне маюць яны для вывучэння Пушкініяны Магілёўшчыны, дазваляюць зрабіць куды больш цікавымі ўрокі літаратуры ў нашых школах.

Пушкін у "Гісторыі Пятра" (Поўн. зб. тв.: У 6 т. М., 1946. Т. 6.) расказвае пра ход Паўночнай вайны са шведамі, прыгадвае пра тое, што цар бываў у Дуброўне, Оршы, Мінску, Гомелі...

Асабліва цікавыя для нас старонкі, прысвечаныя 1708 году, калі руская армія адышла на Магілёўшчыну. Ідзе гаворка пра бой пад Галоўчынам, які стаў для шведаў апошняй у гэтай вайне перамогай, а для рускіх — апошнім паражэннем, пра падзеі ў Магілёве. Потым — звесткі аб тым, што "Пётр с палавінай пяхоты прыбыў у Мсціслаў". Далей — апісанне руху Карла XII ад Магілёва да Чэрыкава, а Пятра — насустрач ворагу да Расны і Чавус, пра яго пераправу цераз Проню і заняцце Доўгавіч. Гаворыцца аб тым, што Пётр рухаўся да Крычава "ў пяці мілях ад Чырыкава".

Прыйшоўшы ў Крычаў, цар "загадаў абозу свайму пераправіцца цераз Сож і стаць лагерам". І далей "сам жа пераехаў пад Крычавам уброд з гвардыяй, злучыўся са сваім абозам і прыйшоў у мястэчка Барысаўка". Трэба адзначыць, што ў гэтым месцы брод быў з вельмі даўніх часоў. Тут адыходзілі нашы войскі ў 1941 годзе, наступалі ў 1943-м.

У кнізе А. С. Пушкіна даволі падрабязна расказваецца пра бой каля вёскі Добрае (цяпер Мсціслаўскі раён) 29 жніўня 1708 года. Гэта недалёка ад Мышкавіч, а таксама Маляціч, у якіх стаяў Карл XII. Атрыманая, першая за некалькі гадоў вайны на Беларусі, у гэтым баі перамога вельмі ўзрадавала Пятра. Ён паведаміў пра яе ў Пецярбург некалькім іншаземным урадам. Аўтар апавядае і пра славутую бітву пад Лясной, дзе Пётр поўнасцю разграміў 16-тысячны корпус генерала Левенгаўпта. Ён піша: "Бітву пад Лясной Пётр назваў затым маці Палтаўскай перамогі".

У Крычаўскім краязнаўчым музеі нямала матэрыялаў і схем, прысвечаных баям войск Пятра ў нашым краі. Паэт высока цаніў дапамогу

беларускага народа рускім войскам. Ён адзначаў, што многія са шведаў загінулі ад рук мужыкоў. Аб гэтым жа знаходзім нямала радкоў у вучонага-гісторыка А. Меера, які пісаў, што крычаўскія мужыкі, стараючыся дапамагчы рускім, закопвалі ў зямлю свае пажыткі і падаваліся ў лес. Перагароджвалі заваламі лясныя дарогі, знішчалі інтэрвентаў, хадзілі ў разведку. А адзін з сялян, які жыў каля Крычава, даў згоду шведам правесці іх самым кароткім шляхам на Украіну, бо ворагі разлічвалі пасля хуткага маршу ўзяць там гарады-крэпасці, але завёў у такія лясныя балоты, адкуль многія захопнікі не змаглі выбрацца. Беларускі Сусанін быў пакараны страшнай смерцю.

У гэты ж час украінскія гарады, да якіх накіроўваўся Карл, паспелі падрыхтавацца да абароны і вытрымалі ўдары з дапамогай падаспеўшых рускіх воінаў. Вось якое стратэгічнае значэнне меў подзвіг невядомага дагэтуль беларускага селяніна-патрыёта.

Ён загінуў ад рук захопнікаў у глыбіні бранскіх лясоў, сярод балот, але выканаў свой абавязак перад радзімай, дапамог рускім братам. Думаецца, паэты і пісьменнікі, скульптары і мастакі Магілёўшчыны яшчэ ўвекавечаць у сваіх мастацкіх творах подзвіг земляка. Вельмі шкада, што нельга ўстанавіць імя героя, але подзвіг яго вядомы і жыве ў людской памяці.

*1991*

*Аляксандр Рогалеў*

# ПУШКІН І ПАСКЕВІЧ: ЭПІЗОДЫ З БІЯГРАФІІ ДВУХ ЗНАКАМІТЫХ ЛЮДЗЕЙ

Паскевіч-Эрыванскі, граф Іван Фёдаравіч, найяснейшы князь Варшаўскі, у гісторыі Гомеля пакінуў след куды больш яскравы, чым заснавальнік новай рускай літаратуры, вялікі паэт Аляксандр Сяргеевіч Пушкін. Уладальнік гомельскага палаца-паркавага ансамбля (з 1834 па 1856 год) і часткі горада (з 1883 года), І. Ф. Паскевіч меў непасрэднае дачыненне да развіцця Гомеля і стварэння яго аблічча. Паэт А. С. Пушкін, як мяркуюць краязнаўцы, толькі аднойчы праязджаў праз Гомель. Першы раз — у 1820 годзе на шляху ў ссылку ў Кішынёў. Другі раз — у 1824 годзе, калі ехаў з Адэсы ў ссылку ў вёску Міхайлаўскае Пскоўскай губерні (тады як быццам ён перасек толькі павятовы горад Новую Беліцу, а ў Гомель не заязджаў).

Усё гэта так. Але аднаго "колькаснага" падыходу да мінулага, нягледзячы на факталагічную аснову, аказваецца мала для ўсебаковага і шматграннага асэнсавання нашай гістарычнай спадчыны. Пераказ фактаў дазваляе ўсвядоміць толькі тое, што зрабіў Паскевіч для Гомеля і што рабіў тут Пушкін, калі спыняўся ў час паездак. Мы ж павінны ведаць і нешта большае, напрыклад, думкі сучаснікаў, іх адзнакі дзейнасці пэўных асоб, узаемныя ўражанні пад час сустрэч.

У дадзеным выпадку невялікі эпізод з біяграфіі І. Ф. Паскевіча і А. С. Пушкіна дазваляе нам зірнуць на славутага фельдмаршала менавіта ў такім аспекце.

Летам 1829 года адбылася паездка Пушкіна на Каўказ у дзеючую армію (апісанне яе можна знайсці ў знакамітым "Путешествии в Арзрум во время похода 1829 года"). Пад час гэтага падарожжа Пушкін меў сустрэчы з галоўнакамандуючым асобным Каўказскім корпусам І. Ф. Паскевічам. Дзякуючы паэту мы можам атрымаць уяўленне аб Паскевічу як аб чалавеку.

Першая сустрэча двух знакамітых людзей адбылася вечарам 13 чэрвеня 1829 года. Да жадання Пушкіна зрабіць паход у радах яго войскаў Паскевіч аднёсся з поўнай спагадай, паколькі, як заўважае Леанід Гросман у рамане "Пушкін", у якім асобныя моманты сустрэч Пушкіна з Паскевічам дапаўняюцца цікавымі фактамі, будучы генерал-фельдмаршал (гэтае званне І. Ф. Паскевіч атрымаў у верасні 1829 года) разлічваў на адпаведныя "водгукі" паэта. Ужо ў самым стаўленні да сус-

трэчы з Пушкіным бачны такія рысы характару І. Ф. Паскевіча, як ганарыстасць і славалюбства, на што ўказвалі ўсе сучаснікі, хто яго добра ведаў.

Гэтыя якасці, а яшчэ самаўладарнасць і саманадзейнасць, што таксама адрознівалі Паскевіча, звычайна ўласцівы найбольш актыўным, няўрымслівым асобам ("пасіянарыям", згодна з тэорыяй Льва Гумілёва), якія здольныя падпарадкоўваць сабе людзей і весці іх за сабой, якія ніколі не супакойваюцца і заўсёды парушаюць інерцыю раўнадушша і імкнуцца да змены таго, што іх акружае.

Нездарма, відаць, галоўнакамандуючы асобным Каўказскім корпусам ішоў ад аднаго поспеху да другога, праводзіў, у прыватнасці, вельмі ўдалыя ваенныя аперацыі, нягледзячы на тое, што меў шматлікіх крытыкаў і нядобразычліўцаў. Ды і пераўтварэнні Паскевіча ў Гомелі, хаця тут ён бываў толькі наездам, таксама сведчаць на карысць "пасіянарнасці" гэтага чалавека.

Пушкіну, безумоўна, імпанавала асоба Паскевіча-генерала. Гэта заўважальна хоць бы ў батальных сцэнах "Путешествия в Арзрум...", дзе паэт зусім не дакучліва, як бы мімаходзь указвае чытачу на высокую вытрымку, бясстрашнасць, рашучасць Паскевіча ў моманты кіравання боем. Уражанне, якое пакінуў баявы генерал Паскевіч у Пушкіна, было моцным. Цікава, што ў прадмове да "Путешествия в Арзрум..." Пушкін растлумачвае сваё жаданне напісаць гэтыя дарожныя нататкі неабходнасцю абараніць ад іроніі назойлівых апанентаў не столькі сябе, колькі імя і справы І. Ф. Паскевіча, удзельніка бітваў пад Барадзіно, Малаяраслаўцам, Лейпцыгам, Парыжам. А ў 1831 годзе, за пяць гадоў да таго, як было напісана "Путешествие..." (1836 год), Аляксандр Пушкін прысвяціў Івану Фёдаравічу Паскевічу наступныя ўхвальныя радкі ў вершы "Бородинская годовщина", напісаным непасрэдна пасля ўзяцця 26 жніўня, у дзень Барадзінскай бітвы, прадмесця мяцежнай Варшавы:

Могучий мститель злых обид,
Кто покорил вершины Тавра,
Пред кем смирилась Эривань,
Кому Суворовского лавра
Венок сплела тройная брань.

"Тройная брань" — гэта перамогі Паскевіча ў трох войнах: з Персіяй (1827–1828), з Турцыяй (1828–1829) і Польшчай (1831). Асоба Паскевіча ў разуменні вялікага паэта ўвасабляла адзінства і магутнасць дзяржавы, яе веліч і прэстыж на міжнароднай арэне. Дастаткова прачытаць верш "Бородинская годовщина", каб упэўніцца ў гэтым (тут І. Ф. Паскевіч названы прадаўжальнікам воінскай славы Суворава). Дарэчы, гэты верш Пушкіна вельмі злабадзённы, актуальны і ў наш час; па сваёй ідэі ён пераклікаецца з такім вядомым пушкінскім вер-

шам, як “Клеветникам России”, напісаным таксама ў 1831 годзе. Няма тут нічога “імперскага”, “захопніцкага”; нельга падмяняць гэтымі паняццямі такое паняцце, як годнасць дзяржавы, што і падкрэсліваў паэт у сваіх творах. Гэтую дзяржаўную годнасць, на думку Пушкіна, мацней за іншых у свой час падтрымліваў І. Ф. Паскевіч.

Для Пушкіна І. Ф. Паскевіч — “бліскучы герой” (гл. “Путешествие в Арзрум...”: “Граф предлагал мне быть свидетелем дальнейших предприятий, но я спешил в Россию. Граф подарил мне на память турецкую саблю. Она хранится у меня памятником моего странствия вослед блестящего героя по завоеванным пустыням Армении”; гэта — эпізод адной з сустрэч з Паскевічам, якая адбылася 19 ліпеня 1829 года).

На старонках “Путешествия в Арзрум...” паэт высока ацаніў арганізатарскія і гаспадарчыя дараванні Паскевіча. У прыватнасці, ён адзначыў “цішыню занятага 10 тысячамі рускага войска горада Арзрума, галоўнага пункта азіяцкай Турцыі, у якім ніводзін з жыхароў не паскардзіўся на насілле салдат”. Немалаважнымі ўяўляюцца і такія дэталі: “За ўвесь час паходу ніводная арба са шматлікага нашага абозу не была захоплена непрыяцелем; парадак, з якім абоз рухаўся за войскам, на самай справе дзіўны”.

Пасля гэтых заўваг А. С. Пушкіна зразумелыя і водгукі наведвальнікаў Гомеля 40–50-х гадоў XIX стагоддзя (у 1840, 1845 і 1851 гадах палац Паскевіча ў Гомелі наведваў сам імператар Мікалай Паўлавіч), якія захапляліся надзвычайным парадкам у горадзе і яго чысцінёй.

І. Ф. Паскевіч пад час сустрэч з Пушкіным імкнуўся выказаць паэту поўную гасціннасць і ветлівасць (“ён быў вясёлы і прыняў мяне ласкава”) і прапанаваў госцю размясціцца ля сваёй стаўкі. Прынамсі, ва ўсім змесце “Путешествия в Арзрум...” мы не знойдзем нават намёку на тое, што паэт адчуваў нейкую несвабоду ці падазронасць з боку штаба. Між тым, Паскевічу было прадпісана захоўваць сакрэтны нагляд за Пушкіным у час знаходжання яго на Каўказе. Галоўнакамандуючы прыняў гэтае прадпісанне, але на справе аказаўся даволі свабодным і самастойным у сваіх поглядах на людзей, нягледзячы на найвышэйшы загад.

Вось такімі ўяўляюцца дэталі сустрэчы дзвюх знакамітых (у тым ліку і для гомельскай мінуўшчыны) асоб — славутага паэта і знакамітага военачальніка.

*1997*

*Ігар Сцяпунін*

# БЕСКАРЫСЛІВЫ ПАКЛОННІК ПУШКІНА

Вядомы пушкіназнаўца і гісторык П. Е. Шчогалеў у 1930 г. упершыню апублікаваў пісьмы многіх карэспандэнтаў А. С. Пушкіна, асабліва вылучыўшы віцябчаніна В. Я. Мызнікава. Аўтар не без падстаў называе яго “бескорыстным обожателем великого русского поэта” [1].

19 верасня 1833 г. Мызнікаў з Віцебска пасылае Пушкіну сваё эмацыянальнае пісьмо, у якім выражае вельмі цёплыя пачуцці да “сонца рускай паэзіі”. “Успомніце, — піша ён, — таго ваеннага афіцэра, які два гады таму, прыехаўшы ў сталіцу, спяшаўся да Вас, каб выказаць сваю павагу!” Пушкін у ягоным разуменні быў сапраўды народным пісьменнікам, які сваімі творамі праславіў Радзіму, і Мызнікаў лічыць сябе гарачым паклоннікам яго таленту. “Падзяляючы, — піша ён, — разам з іншымі сваімі адукаванымі суайчыннікамі любоў да расійскай паэзіі, якую Вы пасялілі ў нас сваімі векавымі тварэннямі, я асмеліўся цяпер на подзвіг даволі смелы”. Мызнікаў выказвае вельмі сціплае пажаданне: просіць у Пушкіна дазволу прысвяціць яму адзін са сваіх вершаў, “упрыгожыцца яго імем”, бо “для парнаскага навічка гэта будзе самым прыемным падбадзёрваннем”.

Пісьмо заканчваецца словамі: “Калі Вы захочаце ўдастоіць Вашага шчырага прыхільніка сваім адказам, то мой адрас: Васілю Якаўлевічу Мызнікаву, ад’ютанту князя Хаванскага, лейб-гвардыі грэнадзёрскага палка паручніку ў Віцебск” [2]. На жаль, адказ Пушкіна не захаваўся.

Хто ж такі гэты “бескорыстный обожатель” Пушкіна, чым ён знакаміты?

Кароткія біяграфічныя звесткі Мызнікава паведамляе пецярбургскі пушкіназнаўца Л. А. Чарэйскі [3]. Але ў яго кнізе не сказана пра дзейнасць Мызнікава на Беларусі.

Як сведчаць матэрыялы Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь (НА РБ), Мызнікаў з 1823 па 1828 г. выконваў абавязкі настаўніка малодшых класаў юнкерскай школы ў Магілёве. “За стараннасць і по-

---

[1] Щеголев П. Е. Обожатели Пушкина: По неизданным материалам // Московский пушкинист. 1930. Т. 2. С. 187.

[2] Пушкин А. С. Пол. собр. соч.: В 16 т. М., 1948. Т. 15. С. 82.

[3] Черейский Л. А. Пушкин и его окружение. Л., 1989. С. 279.

спехі ў выкладанні гісторыі і расійскай славеснасці армейскім падпрапаршчыкам галоўнакамандуючым 1-й арміяй яму была аб'яўлена асаблівая ўдзячнасць, ён узнагароджаны таксама залатым гадзіннікам з такім жа ланцужком" [4].

Мызнікаў, паводле слоў блізка ведаўшага яго генерал-маёра Р. І. Філіпсона, "быў чалавек для таго часу развіты і адукаваны" [5]. У службовым спісе Мызнікава на пытанне, "ці мае веды ў якіх навуках", дадзены адказ: "па гісторыі, геаграфіі, арыфметыцы, геаметрыі, трыганаметрыі, алгебры, стратэгіі, чарчэнню планаў, маляванню, ваенна-судовай часці, вядзенню ваенна-судовых спраў, фехтаванню і верхавой яздзе" [6]. Ён таксама ведаў французскую і нямецкую мовы, "ведаў і любіў літаратуру", з'яўляўся супрацоўнікам "Литературных приложений" да "Русского инвалида", куды дасылаў свае вершы" [7]. Адзін са сваіх вершаў ("произведений кратких военных досугов") ён і прысвяціў Пушкіну.

З 20 сакавіка 1828 г. Мызнікаў прызначаны ад'ютантам віцебскага генерал-губернатара князя М. М. Хаванскага і выконвае абавязкі чыноўніка па асобных даручэннях [8]. Даручэнні былі самыя розныя. З чэрвеня 1828 г. і 10 чэрвеня 1834 г. ён пабываў ў некалькіх гарадах Магілёўскай губерні (Бабінавічы, Шклоў і інш.), каб весці барацьбу "супраць злоўжыванняў па продажу спіртных напояў". Мызнікаў высветліў, што віноўнікамі ўсіх злоўжыванняў былі не толькі гаспадары піцейных устаноў (карчмары), але і некаторыя афіцэры царскай арміі (капітан 1-га карабінернага палка Дэмарцье і іншыя), якія кантрабандным шляхам прывозілі з сабой спіртныя напоі, што прыводзіла "да ўсялякіх беспарадкаў" [9].

У перыяд паўстання 1830–1831 гг. Мызнікаў па загаду генерал-губернатара выконваў абавязкі віцебскага паліцмайстра. Ён змагаецца за ліквідацыю антысанітарных умоў у віцебскай турме. У гэтай турме адбывалі пакаранне палонныя шляхціцы-паўстанцы [10]. У ліку іх быў дваццацігадовы беларускі шляхціц Павел Астроўскі, гісторыя якога паслужыла канвой сюжэта рамана Пушкіна "Дуброўскі". Як чыноўнік па асобных даручэннях, адказны за судаводства, Мызнікаў не мог не ведаць справы Астроўскага. [...]

Мызнікаву давялося яшчэ быць сведкам другога бяспраўя. З 14 сакавіка па 27 красавіка 1833 г. ён разам з губернскім страпчым

---

[4] НА РБ. Ф. 1297, воп. 1, спр. 2889, арк. 1–3.

[5] Воспоминания Г. И. Филипсона. М., 1885. С. 33.

[6] НА РБ. Ф. 1297, воп. 1, спр. 2889, арк. 76.

[7] Венгеров С. А. Источники словаря русских писателей. Пг., 1917. Т. 4. С. 458–459.

[8] НА РБ. Ф. 1297, воп. 1. спр. 2889, арк. 3–4.

[9] Тамсама. Спр. 3096, арк. 1–71.

[10] Тамсама. Спр. 2889, арк. 51, 75; спр. 4840, арк. 4–6.

Ф. Ф. Зайкоўскім праводзіў даследаванне аб злоўжываннях у Люцынскім старостве Віцебскай губерні, якое знаходзілася ў пажыццёвым уладанні графа Іосіфа Борха. Следства ўстанавіла, што купец Злотнікаў, які быў арандатарам маёнтка графа Борха, і дваранін Рэут, паверапы ў справах Борха, "не лічылі патрэбным разлічвацца з сялянамі, якія высылаліся на іншыя работы ў іншыя губерні". А аканом графа Краманецкі нахабна прысвойваў сялянскія грошы. Сяляне не мелі права скардзіцца, іх адразу ж аб'яўлялі "бунтаўшчыкамі" і вельмі строга каралі. Выклаўшы ўсе гэтыя факты, Мызнікаў заклікае губернатара аб'ектыўна разабрацца ў тым, што адбываецца, і заклікаць да парадку махляроў. Але губернатар, наадварот, пачаў абараняць маючых уладу. Па яго рашэнню сялянам было зроблена строгае ўнушэнне, каб "оные из повиновения владельцев выходить не осмеливались". Участковаму дваранскаму засядацелю даручана мець "за поведением оных неослабное смотрение", а сялян, якія адкрыта выступалі супраць бяспраўя, судзіць як "бунтаўшчыкоў" [11].

Мызнікаў разумеў, што пры існуючых парадках немагчыма выправіць зло. Яго рознагалоссі з генерал-губернатарам узмацняюцца.

З 26 чэрвеня 1833 г. па загаду князя Хаванскага ён прымае ўдзел у рабоце следчай камісіі па палітычнай справе Тадэвуша (Фадзея) Лады-Заблоцкага, паэта-рамантыка, аўтара паэмы "Аколіцы Віцебска", вершаў "Вілія", "Да Дзвіны", "Да Лучосы" і іншых, дзе апяваліся працоўны беларускі народ, яго гераічная гісторыя, прыгажосць беларускіх лясоў і азёр. Заблоцкі вучыўся ў віцебскай гімназіі, а пасля заканчэння яе ў 1831 г. быў накіраваны за казённы кошт на літаратурнае аддзяленне Маскоўскага універсітэта. У 1833 г. яго за "антыўрадавую дзейнасць" выключылі з універсітэта, арыштавалі, пад канвоем накіравалі ў Віцебск і пасадзілі ў турму [12]. Тут, у горадзе над Дзвіной, над ім і яго аднадумцамі вяршыўся суд. Следства выкрыла перапіску Заблоцкага з віцебскім дваранінам Зянонам Міхалоўскім, а ў старшага настаўніка лацінскай мовы Уладзіслава Шапялевіча знайшлі пісьмо Заблоцкага на імя Міхалоўскага, у якім былі рэзкія выпады супраць царскага самадзяржаўя. Князь Хаванскі даручае Мызнікаву і дырэктару вучылішчаў Віцебскай губерні І. А. Гарстоўскаму ўважліва "праверыць усе паперы Шапялевіча і даць сваё заключэнне". Мызнікаў і Гарстоўскі не знайшлі ў паперах Шапялевіча нічога крамольнага, але князь Хаванскі не прыняў да ведама іх доказы. Па яго загаду Шапялевіч быў залічаны ў "злачынцы другога разраду". Цяжка хворага настаўніка выгналі з гімназіі, паўгода трымалі ў турме і толькі пасля настойлівых просьбаў усёй следчай камісіі губернатар дазволіў яму выехаць з Віцебска ў Невельскі павет

[11] НА РБ. Ф. 1297, спр. 2889, арк. 71; спр. 6159, арк. 34–38.

[12] Пачынальнікі: З гісторыка-літаратурных матэрыялаў XIX ст. Мн., 1977. С. 484.

да бацькоў "для папраўкі здароўя". Але працаваць настаўнікам яму было катэгарычна забаронена.

Князь Хаванскі патрабуе новых ахвяр. 8 студзеня 1834 г. спецыяльным прадпісаннем ён даручае Мызнікаву і казённых спраў страпчаму Зайкоўскаму "правесці даследаванне па даносу двараніна Калянкоўскага на паштаўтрымальніка Падзвінскага, які быццам бы гаварыў супраць асобы гасудара імператара дзёрзкія словы, і паступіць з ім згодна з прадпісаннем". Але Мызнікаў, па сутнасці, не выканаў загад генерал-губернатара. У сваім рапарце ён пісаў, што асоба даносчыка Калянкоўскага не ўнушае яму ніякага даверу. Калянкоўскі, на яго думку, амаральны чалавек. Спачатку падзяляў палітычныя перакананні Заблоцкага, а калі пачаўся працэс па справе гэтага "бунтаўшчыка", ён загаварыў пра сваю "глыбокую адданасць гасудару імператару і ўсяму найсвятлейшаму двару". І ўзвёў паклёп на "добрага чыноўніка" толькі для таго, каб неяк выблытацца з гэтай гісторыі. Даносчыкі, на думку Мызнікава, павінны выклікаць толькі непрыемныя пачуцці, ім нельга давяраць. Думку Мызнікава падтрымалі ўсе члены камісіі — князю Хаванскаму прыйшлося пайсці на ўступкі.

Мызнікаў стараўся хоць крыху змякчыць лёс "злачынцаў першага разраду" — Заблоцкага і Міхалоўскага, якія ўтрымліваліся цэлы год у віцебскай турме, а потым па прыгавору Мікалая І былі адданы ў салдаты і сасланы на Каўказ. Свой удзел у следчай камісіі Мызнікаў лічыў цяжкай павіннасцю. Некаторыя следчыя справы ім нават не былі падпісаны, бо ён спрабаваў так ці інакш ухіліцца ад следства, паехаць "па справах службы" ў Лепель ці іншы горад [13]. Усё гэта выклікала незадавальненне генерал-губернатара. У "фармулярным спісе аб службе і годнасці лейб-гвардыі грэнадзёрскага палка паручніка Мызнікава" невыпадкова пры ўпамінанні ўсіх службовых даручэнняў віцебскага карэспандэнта Пушкіна, "выкананых здавальняюча", не сказана аб яго ўдзеле ў следчай камісіі па справе Лады-Заблоцкага. Але, нягледзячы на незадавальненне генерал-губернатара, Мызнікаў не жадаў выконваць жорсткія і несправядлівыя загады свайго непасрэднага начальства. У 1836 г. ён быў вызвалены ад пасады ад'ютанта і чыноўніка па асобых даручэннях пры генерал-губернатары.

Знешне гэта звальненне мела зусім прыстойную форму. Мызнікаў просіць князя Хаванскага аказаць яму садзейнічанне ў пераводзе на іншую работу ў Адэсу або Кішынёў. Сваю просьбу ён дыпламатычна тлумачыць тым, што яго жонка цяжка хварэе і "для папраўкі здароўя ёй патрэбна перамена клімату". 22 снежня 1833 г. князь Хаванскі,

[13] НА РБ. Ф. 1297, воп. 1, спр. 6157, арк. 34–38; ф. 1430. воп. 1, спр. 3814, арк. 223, 245; ф. 3157, воп. 1, спр. 181, арк. 35, 75–76, 131.

жадаючы пазбавіцца ад непажаданага для яго чыноўніка, пасылае пісьмо новарасійскаму генерал-губернатару графу М. С. Варанцову, які варожа адносіўся да Пушкіна, з просьбай аказаць садзейнічанне Мызнікаву, прычым дае добрую атэстацыю свайму падначаленаму. Мызнікаў, паводле яго слоў, "вызначаўся пры добрай адукацыі стараннасцю да службы, цвёрдым характарам і дакладным выкананнем свайго абавязку". Але граф Варанцоў, "полу-милорд, полу-купец" (як яго называў Пушкін), не мог выносіць людзей з цвёрдым і незалежным характарам. Таму 19 студзеня 1834 г. граф Варанцоў рашуча адмаўляе, адзначаючы, што ў яго "колькасць ад'ютантаў па асобных даручэннях абмежаваная". Але Мызнікаў па-ранейшаму імкнецца пакінуць службу ў князя Хаванскага. 20 верасня і 7 снежня 1836 г. ён двойчы прасіў у генерал-губернатара прадаставіць яму адпачынак "па сямейных абставінах" і дазволіць яму выехаць у Санкт-Пецярбург. Знаходзячыся ў Пецярбургу, Мызнікаў нечакана піша новы рапарт: просіць "садзейнічання ў прыкамандзіраванні яго да гвардзейскага ўзорнага палка для правядзення франтавой службы". Генерал-губернатар ахвотна дае згоду, і Мызнікаў назаўсёды пакідае Віцебск.

Узнікае пытанне, калі Мызнікаў сустракаўся з Пушкіным? Па яго пісьму ад 19 верасня 1833 г. відаць, што ён два гады назад спяшаўся з Віцебска да Пушкіна ў Пецярбург, каб выказаць сваю павагу. Гэта было ў 1831 г. 28 мая 1831 г. Мызнікаў просіць дазволу ў віцебскага генерал-губернатара "адлучыцца на 28 дзён па сямейных абставінах у горад Вялікія Лукі Пскоўскай губерні і Невельскі павет Віцебскай губерні" [14]. У чэрвені гэтага года ён наведвае Санкт-Пецярбург, і тады адбываецца яго сустрэча з Пушкіным. Мызнікаў быў першым віцябчанінам, які ад імя "сваіх адукаваных суайчыннікаў" вітаў паэта вялікай рускай зямлі.

*1996*

[14] НА РБ. Ф. 1297, воп. 1, спр. 2889, арк. 13, 37, 50, 56, 70.

*Сямён Ратгаўз*

# ШЭСЦЬДЗЕСЯТ ДВА РАДКІ ПУШКІНА

Уявім сабе Оршу ў адзін са спякотлівых ліпеньскіх дзён 1833 года.

Жыхары горада, нядаўна адноўленага пасля напалеонаўскага нашэсця, у тую раніцу, відаць, нямала былі ўсхваляваны. Яны перадавалі адзін аднаму трывожную навіну — у доме, дзе жыў настаўнік Аляксандр Лубкін, зроблены вобыск. У настаўніка забралі нейкія недазволеныя паперы, а самога жандары павезлі па Пецярбургска-Кіеўскім тракце.

Усё гэта не было выдумкай. Спецыяльная следчая камісія ў Віцебску ўжо каторы час займалася справай нелегальнага рэвалюцыйнага таварыства, якое жандарам удалося раскрыць.

Гэтую рэвалюцыйную арганізацыю, амаль праз 150 гадоў, “адкрыў” для нас, працуючы над невядомымі дакументамі ў Дзяржаўным гістарычным архіве БССР, выкладчык Мінскага інстытута культуры, кандыдат гістарычных навук У. Пасэ. У яе, як відаць з папер, уваходзілі ў асноўным жыхары Віцебскай губерні і выхадцы з Беларусі, якія займаліся ў Маскоўскім імператарскім універсітэце. Тоўстыя тамы следчых матэрыялаў далі даследчыку магчымасць даведацца пра невядомую раней вялікую групу рэвалюцыйна настроеных актыўных праціўнікаў самадзяржаўя, якія адначасова дзейнічалі на Віцебшчыне і ў Маскве, былі звязаны паміж сабою.

Але тут гутарка пойдзе не пра членаў гэтага тайнага таварыства, а толькі пра аднаго чалавека — Аляксандра Лубкіна, які цікавы зусім з іншага боку. У. Пасэ, не без падставы, лічыць да гэтага невядомага ні гісторыкам, ні літаратуразнаўцам настаўніка адным з першых у Беларусі распаўсюджвальнікам нелегальнага спісу аднаго з вершаў вялікага рускага паэта Аляксандра Сяргеевіча Пушкіна. Безумоўна, ён рабіў гэта не толькі з любові да незвычайнага таленту паэта, але і па сваіх рэвалюцыйных перакананнях.

Хто ж ён, Аляксандр Лубкін? Вядома толькі, што ён выкладаў матэматыку ў Аршанскім павятовым вучылішчы. Тады іх у горадзе існавала два: аднагадовае пачатковае і пяцікласнае дваранскае. Можна меркаваць, што Лубкін працаваў менавіта ў другім, дзе дзецям дваран давалі больш шырокія веды. Педагог, безумоўна, закончыў Маскоўскі універсітэт і быў малады, як і ўсе астатнія прыцягнутыя да следства арышта-

ваныя. З архіўных матэрыялаў беларускі гісторык устанавіў, што настаўнік з'яўляўся сувязным, кур'ерам паміж тайным літаратурным таварыствам у Маскоўскім універсітэце і членамі гэтай арганізацыі ў Беларусі. Ён перавозіў пісьмы і матэрыялы, якія з-за іх рэвалюцыйнага зместу нельга было адпраўляць па пошце. У час паездак у Маскву малады аршанец сустракаўся з віднымі ўдзельнікамі тайных таварыстваў ва універсітэце, многіх з якіх ён, мабыць, ведаў асабіста і перавозіў, па іх просьбах, розную нелегальшчыну на родную Віцебшчыну, хаця часам і ад яго яе тэкст быў утоены ў запячатаных канвертах.

У адным са знойдзеных жандарамі рэкамендацыйных пісем Лубкіну даюць вельмі пахвальную характарыстыку: "Уручальнік гэтага Аляксандр Лубкін... цудоўны хлопец, вельмі добрага складу думак, высакародны, і ты [г. зн. атрымальнік. — *С. Р.*] можаш з ім свабодна гаварыць аб усім. За свой незалежны характар даволі шмат пацярпеў ад начальства, і таму можаш яму верыць гэтак жа, як мне самому".

Гэтае пісьмо ўцалела выпадкова і трапіла ў следчую справу толькі таму, што чалавек, якому яно было адрасавана, наперакор указанню, якое ў ім змяшчалася, не спаліў яго пры атрыманні.

Але што ж яшчэ акрамя ролі сувязнога інкрымінавалася настаўніку павятовага вучылішча? Ахоўнікі парадку ў час вобыску ў аршанскім доме Лубкіна знайшлі адзін з рукапісных спісаў верша А. С. Пушкіна "Деревня", распаўсюджаных у Расіі. Гэта вядомы цяпер кожнаму школьніку і ўсім прыхільнікам таленту вялікага паэта адзін з ранніх твораў.

Прыгадаю яго шырока папулярныя цудоўныя радкі:

Приветствую тебя, пустынный уголок,
Приют спокойствия, трудов и вдохновенья,
Где льется дней моих невидимый поток
    На лоне счастья и забвенья.

Аказваецца, у гэтага верша не просты лёс. Ён напісаны паэтам у Міхайлаўскім у 1819 годзе пасля выхаду з "манастырскіх", як называў ён, ліцэйскіх сцен. Гэты верш, як і ода "Вольность", згодна з меркаваннямі пушкіністаў, напісаны пад уплывам блізкага знаёмага дзекабрыста М. І. Тургенева, самага гарачага праціўніка прыгонніцкага права. Таму ў ім так моцна, гнеўна, пратэстуюча гучыць антыпрыгонніцкая, свабодалюбівая ідэя:

Здесь Барство дикое, без чувства, без Закона,
Присвоило себе насильственной лозой
И труд, и собственность, и время земледельца.
Склонясь на чуждый плуг, покорствуя бичам,
Здесь Рабство тощее влачится по браздам
    Неумолимого Владельца.
Здесь тягостный ярем до гроба все влекут...

Калі чутка пра палітычныя рукапісы Пушкіна дайшла да Аляксандра I, ён запатрабаваў іх для прагляду. Не без апаскі, праз Чаадаева, Пушкін паслаў верш у палац. Імператар потым двурушна дзякаваў паэту “за добрые чувства” (“и рабство падшее по манию царя”), выказаныя ў ім. Але лёс твора быў надоўга прадвызначаны. Толькі ў 1826 годзе была апублікавана яго першая, лірычная палова пад назвай “Уединение”, а другая частка, пачынаючы са слоў “но мысль ужасная здесь душу омрачает”, была цалкам апушчана — амаль 30 радкоў. Паэт замяніў іх радкамі шматкроп’я, намякаючы чытачу, што ў рукапіса ёсць працяг.

Вось які верш А. С. Пушкіна знайшлі ў Оршы. Поўны, нецэнзураваны і пад сапраўднай назвай — “Деревня”. Па коснай думцы царскіх служак — “крамольны” і “недазволены”. У гэтых жа радках паэт гнеўна бічаваў прыгонніцтва, і гэтыя радкі, як лічыць аўтар знаходкі, былі цалкам сугучны настроям маладых членаў віцебскай арганізацыі і асабліва тых, хто забяспечыў вершам аршанскага настаўніка. Лубкін на допытах так і не назваў прозвішча асобы, якая перадала яму гэты спіс твора. З запісак царскай следчай камісіі відаць, што генерал-губернатар Смаленскай, Віцебскай і Магілёўскай губерань загадаў “далучыць да справы і рускія вершы пад назвай “Деревня”. Далучыць творчасць паэта як рэчавы доказ!

Пакуль невядома, колькі чалавек да арышту Лубкіна паспелі ў Оршы прачытаць поўны тэкст “Деревни”, але што многія — можна не сумнявацца. Яго чыталі, запаміналі. Трэба меркаваць, што ў настаўніка ў горадзе і, магчыма, у Віцебску былі аднадумцы і сябры, з якімі на час дзяліўся сваім каштоўным спісам.

Доўгі ж час, нават пасля 1833 года, другая палова твора для масавага рускага чытача была недаступная.

Дакументамі Дзяржаўнага гістарычнага архіва БССР У. Пасэ прыадкрыў нам невядомыя старонкі гісторыі, выявіў адзін з ранніх шляхоў пранікнення ў Беларусь вершаў песняра “вольности святой”, сябра дзекабрыстаў.

Застаецца толькі паведаміць, што ўдалося цяпер даведацца пра далейшы лёс Аляксандра Лубкіна, сувязнога тайнай арганізацыі, прыхільніка творчасці Пушкіна, якую ён выкарыстаў для рэвалюцыйнай справы. З архіўнага матэрыялу відаць, што, паколькі следчым, нягледзячы на ўсе іх намаганні, не ўдалося ўстанавіць факт прамой прыналежнасці настаўніка да тайнай арганізацыі, Лубкін быў аддадзены “пад тайны нагляд” па месцы жыхарства. Вока аршанскай паліцыі сачыла за ім нястомна. Павятовы паштмайстар атрымаў заданне перлюстроўваць усю яго перапіску, усё падазронае забіраць і дастаўляць “куды трэба”. Лубкіна неадкладна звольнілі з пасады настаўніка. Больш ніякіх дакументаў пра яго няма.

Вось што прыадкрылася ў гэтай гісторыі з рукапісным спісам верша “Деревня” з 62 радкоў. Такая, хаця і невялікая, старонка Пушкініяны. Накіраваныя супраць самадзяржаўя і прыгоннага права радкі Пушкіна ўжо больш чым 150 гадоў назад, яшчэ пры яго жыцці, знаходзілі ў Беларусі ўдзячнага чытача.

*1979*

KAMUNIKAT.org

*Ігар Пушкін*

# ПУШКІНЫ. АДКУЛЬ ЯНЫ?

У Магілёве, у цэнтральнай частцы Машэкаўскіх могілак (раён Юбілейны), ёсць невялічкае пахаванне. Надпіс сведчыць, што тут у мінулым стагоддзі пахаваны “младенец Александр Пушкин”. Давялося чуць такое меркаванне: “А ці не меў ён нейкіх адносін да паэта А. С. Пушкіна? Магчыма, апошні, праязджаючы праз Магілёў, паспеў пакінуць тут нашчадкаў. А мо ягоныя сваякі перасяліліся сюды?”

Адкуль жа ўзяліся Пушкіны на Беларусі? Давайце паразважаем. Аляксандр Сяргеевіч выводзіў свой радавод ад “Григория Пушки, который в XIII веке пришел из Новугородка”. Звяртаю вашу ўвагу на прозвішча. Часта яго паходжанне звязваюць са словам “пушка” ў абазначэнні артылерыйскай зброі. Але ў XIII ст. такой зброі на тэрыторыі Беларусі і Масковіі не ведалі. Ды і пазней у Маскоўскім княстве яе называлі па-рознаму. Значыць, напачатку слова “пушка” мела нейкі іншы сэнс. І яно ёсць у беларускай мове. У беларуска-рускім слоўніку чытаем: “Пушка, пушачка — коробка, коробочка”. Яшчэ зусім нядаўна слова гэтае ўжывалася ў асобных мясцінах Слаўгарадчыны. Вось мы і наважыліся выказаць меркаванне: “Пушкіны ў Маскоўскае княства прыйшлі з Беларусі”.

На карысць такое высновы, як нам падаецца, — яшчэ два факты. Яны датычаць геральдыкі.

Вядомы расійскі знаўца геральдыкі А. Б. Лакіер у сваёй кнізе “Русская геральдика” (СПб., 1855) пісаў наконт гербаў радоў прышлых: “то из немец, то из Семиградской земли, то, наконец, из земель славянских”. Да прышлых ён адносіць і герб Пушкіных. Яго Лакіер апісвае наступным чынам: тарча (шчыт) падзелена на дзве паловы, у верхняй у гарнастаевым полі — сімвале чысціні — ляжыць на пурпурнай падушцы з залатымі кутасамі княская шапка. Ніжняя палавіна таксама падзелена на дзве часткі: у правай на блакітным полі — рука з мячом, у левай — на залатым полі блакітны арол са скіпетрам і дзяржаваю ў кіпцюрах. Арол сведчыў аб сувязях з Прусіяй, а руку з мячом можна знайсці на гербе Мсціслава (спрадвечныя беларускія землі). А. Лакіер разглядае такі варыянт герба як адну з разнавіднасцей герба “Пагоня”.

У 1900 г. выйшла кніга “Heraldyka” (СПб.), на рускай мове, у якой быў надрукаваны “Гербовник Витебского дворянства” паводле матэры-

ялаў рукапісу XVIII ст. На старонцы 164 паведамляецца: “Пушкины, герба “Шелига” издавна владели оседлостями в Новогородском, Минском, Мстиславском воеводствах”. Герб “Шэліга” напоўнены такімі складнікамі: у чырвоным полі залаты паўмесяц рагамі цягнецца ўгору, з сярэдзіны яго выходзіць залаты крыж. У нашлёмніку паўлінавыя пер’і. Узнікненне герба адносяць да XV ст., калі ў выніку ўпартай барацьбы праваслаўная шляхта дамаглася права мець свае гербы. У XV ст. сягаюць карані Пушкіных з віцебскага гербоўніка.

Патрэбна заўважыць, што назву Новогород, ці Новугород, можна аднесці як да Ноўгарада, так і да Навагрудка. Але той жа Лакіер ужывае назву Новугорад, калі піша: “...князь Галицкий потерпел поражение и отступил к Новугородку”. Хіба гэта не доказ, што размова ідзе пра сучасны беларускі горад Навагрудак? Зважаючы на прыведзеныя вышэй звесткі, нам здаецца, можна зрабіць выснову — Пушкіны былі выхадцамі з беларускай зямлі і менавіта адсюль, а не наадварот, частка іх трапіла ў Маскоўскае княства.

Некалькі заўваг і меркаванняў наконт прозвішчаў Пушкіны, Пушкаровы і чаму гармата стала ў рускай мове называцца пушкай. З гістарычных крыніц вядома, што патрапіла гэтая зброя з Заходняй Еўропы ў Масковію праз Беларусь. Галоўным у ёй было не металічная труба, з якой нешта вылятала, а “адское зелле”, вядомае пад назвай “порах”. Яно было галоўным і каштоўным, бо без яго гармата не зброя. Хавалася “зелле” ў спецыяльнай скрыні — “пушке, пушечке”, якую вазілі ўслед за металічнай часткай зброі. На скрыні звычайна сядзеў і ахоўваў яе вартавы. Вось ад назвы скрыні (пушкі) хутчэй за ўсё і сталі пазней называць усю гармату пушкай у Расіі. А вартавога гэтай скрыні — Пушкаровым, Пушкаром і г. д.

*1994*

*Тимофей Лиокумович*

# ПОТОМКИ ПУШКИНА В БЕЛОРУССИИ

Интерес к “белорусской ветви” рода Пушкиных возник у меня в деревне Телуша Бобруйского района. Там, в центре деревни, под вековыми липами, я увидел старую могилу, огороженную аккуратной деревянной оградкой. Можно понять мои чувства, когда я, приблизившись к ограде, прочел на мемориальной плите: “Наталья Александровна Пушкина. По мужу Воронцова-Вельяминова. 3 дек. 1912 г. 53 лет”.

Местные жители говорили, что действительно в их селе похоронена внучка А. С. Пушкина. Однако никто не мог обьяснить, как она попала на Бобруйщину.

Заинтересовавшись, я стал искать ответ в подшивках старых журналов и газет. Нашел то немногое, что было к тому времени написано о детях поэта. Однако нигде не было упоминаний, что кто-то из близких Пушкина жил в Белоруссии. Поиски привели меня в Москву, и там я познакомился с дочерью Натальи Александровны — Софьей Павловной Воронцовой-Вельяминовой, а также с другими потомками поэта. Их рассказы и письма помогли во многом представить картину жизни “белорусской линии” Пушкина в Белоруссии.

Как известно, у Александра Сергеевича Пушкина было 19 внуков и внучек. Наталья Александровна — одна из них. Ее отец — старший сын Пушкина — Александр Александрович. Это о нем поэт писал: “Не дай бог ему идти по моим следам, писать стихи да ссориться с царями! В стихах он отца не перещеголяет, а плетью обуха не перешибет”.

А. А. Пушкин (1833–1914) — известный русский генерал, кавалер многих орденов, участник русско-турецкой войны 1877–1878 годов. Сохранилось воспоминание, что при переходе через Дунай он обратился к своим солдатам с таким словом воодушевления: “Гусары! Перед нами Болгария — священная славянская земля! Там погибают наши братья и сестры! Они ждут нашей помощи!” За храбрость, проявленную в боях за освобождение Болгарии, Пушкин был пожалован золотой саблей и орденом св. Владимира. Все, знавшие сына поэта, отмечали его необыкновенную скромность, прямоту, искренность; подобно отцу, он очень любил детей.

Наталья — старшая дочь А. А. Пушкина. Родилась она в 1859 году в Петербурге, ее детство и юность прошли в тихом подмосковном го-

родке Лопасня (теперь город Чехов), где продолжительное время был расквартирован полк, которым командовал ее отец.

Александр Александрович свято хранил память об отце, оберегал его честь от различных кривотолков. Это благоговейное отношение к поэту унаследовала и Наталья Александровна и в свою очередь передала детям.

Большое влияние на Наталью оказала и тетя — дочь А. С. Пушкина Мария Александровна, по мужу Гартунг. Это ее умом, величавостью, приветливостью восхищался Лев Николаевич Толстой. Некоторые ее черты он отразил в образе Анны Карениной, а судьба ее мужа Л. Н. Гартунга нашла выражение в заключительной сцене драмы "Живой труп". Наталья неоднократно виделась с Марией Александровной в Лопасне. С конца 1880 года, когда скончалась жена А. А. Пушкина, М. Гартунг переехала к брату и некоторое время помогала ему растить детей (своих у нее не было). Мария Александровна в совершенстве владела французским и немецким языками, тонко чувствовала музыку, прекрасно играла на фортепьяно, отлично знала западную и русскую литературу (к месту сказать, она была дружна с И. С. Тургеневым, Ф. М. Достоевским и другими русскими писателями, а позднее — с А. В. Луначарским). Племянники боготворили свою тетю.

Наталья получила не только домашнее образование. Одно время она училась в Виленской гимназии. Ей пришлось увидеть многие города России, так как по роду службы отец вынужден был менять местожительство. Живой ум, начитанность, красота и обаяние выделяли Наталью Александровну среди сверстниц. Мужем Натальи Александровны стал служивший в полку А. А. Пушкина Павел Аркадьевич Воронцов-Вельяминов. В чине ротмистра он принимал участие в освободительном походе в Болгарию. Павел Аркадьевич отличался бесстрашием, удостоился за мужество серебряной сабли. Это был человек чести, доброго сердца, нравственного благородства.

Вскоре после женитьбы П. А. Воронцов-Вельяминов подал в отставку и уехал с молодой женой в имение своей матери Вавуличи (сейчас деревня Дубовка в 10 километрах от Бобруйска). Таким вот образом одна из представительниц пушкинского рода оказалась в Белоруссии. Здесь она провела большую часть своей жизни.

От природы Наталья Александровна была разносторонне одаренной. Она хорошо рисовала. Ее внук Сергей Клименко писал мне, что в их семье хранился альбом с бабушкиными рисунками. Мать Сергея иногда показывала эти рисунки детям. В большей части это были пейзажи, но встречались и портреты. К сожалению, альбом этот утерян.

Внучка поэта сочиняла стихи, хотя и не печатала их, так как имя Пушкина ко многому обязывало. Известно, что у нее была тетрадь, в которой она записывала многие из своих шутливых экспромтов. Так,

у С. Клименко хранится сатирическое стихотворение, которое довольно метко передает картину жизни городка Козлова (ныне Мичуринск), где вместе с отцом некоторое время жила Наталья Александровна.

